Падляшша ў аб'ектыве →3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

У Гарадку пішуць! → 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 50 (2900) Год LVI | Беласток, 11 снежня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Сцяпан Копа - лаўрэат

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Сцяпан Копа, народжаны ў 1945 г. у Малінніках, выхаванец Бельскага беларускага ліцэя, выпускнік Вышэйшай педагагічнай школы ў Кельцах, музыка, фалькларыст, аніматар культуры, настаўнік, нястомны папулярызатар музычнай культуры сярод падляшскіх беларусаў, мае ўжо на сваім рахунку восем кніг пра родную песню — рэпертуарных зборнікаў беларускіх фальклорных калектываў — м.інш. зборніка песень „Мая зямля" (1991), калектываў з Дабрывады (1994), Тыневіч (1995), Арэшкава (2003), з'яўляецца таксама музычным рэдактарам выдання „Падляшскі спеўнік" (каля трохсот абрадавых і неабрадавых песень, з апрацаваным нотным запісам), „Песні Бельскай зямлі" (2006), „Хрысцінныя песні ўсходняй Беласточчыны" (2008) — разам больш за 1500 песень з нотнай апрацоўкай.

Неўзабаве з друку выйдзе зборнік „Песні Гарадоцкай зямлі". У апошні час Сцяпан Копа збірае песні з Сакольшчыны і Дуброўшчыны ды Лукі. 34 гады быў музычным кіраўніком калектыву „Расспяваны Гарадок", працаваў з іншымі беластоцкімі калектывамі і кабарэ. Будучы працаўніком Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, шмат гадоў прысвяціў аказванню спецыялістычнай падтрымкі калектывам Беласточчыны. З 1978 года падарожнічае і спісвае народныя песні.

— Сцянапа Копу можна параўнаць з найбольшымі збіральнікамі песень, а каштоўнасць ягоных збораў — з працай Федароўскага, — лічыць прафесар Аляксандр Баршчэўскі, адзін з членаў Капітула ўзнагароды імя Вітальда Гулевіча, у якой у сёлетнім XVI выпуску лаўрэатам стаў Сцяпан Копа ў жменьцы пераможцаў з заяўленых 126 заслужаных асоб. — Я заявіў Сцяпана Копу да ўзнагароды як стваральніка і захавальніка беларускай культуры.

Сцяпан Копа са сваім неадлучным гармонікам сграваў залу да супольнага спеву „Касіў Ясь канюшыну" 30 лістапада ў Доме літаратуры на Кракаўскім прадмесці ў Варшаве.

Журы XVI выпуску Узнагароды імя Вітальда Гулевіча ў складзе Аляксандр Баршчэўскі, Багдан Драздоўскі, Рамуальд Карась, Збігнеў Маеўскі, Мікалай Мэляновіч, Станіслаў Ян Растваровскі, Войцех Станьчак, Гжэгаж Вісьнеўскі, Веслаў Тужанскі заявіла, што з ліку 126 кандыдатур, заяўленых да ўзнагароды, магло адзначыць толькі сціплую іх частку, хоць усе былі яе вартыя — людзі творчыя, разумныя, прыгожыя ды баявітыя. Узнагарода імя Вітальда Гулевіча была ўстаноўлена ў стагоддзе яго нарадзінаў (1895-1941), а ў склад заснавальнікаў яе капітула ўвайшлі Саюз польскіх пісьменнікаў, Польскае радыё, Фонд „Дапамогі палякам на Усходзе", выдавецтва літаратараў „Rój", выдавецтва журналістаў „Pod Wiatr". Ужо 16 гадоў прызначаюць узнагароды за літаратурную, публіцыстычную, выдавецкую і грамадскую дзейнасць. Такі шырокі тэматычны абсяг быў удзелам жыцця і творчасці Вітальда Гулевіча, адной з найпрыгажэйшых постацей міжваеннага дваццацігоддзя Польшчы — паэт, выдавец, празаік, аўтар кнігі пра Бетховена, радыёвец, перакладчык з нямецкай мовы, удзельнік першай сусветнай вайны і Вялікапольскага паўстання, віленчук з выбару, рэдактар падпольнай прэсы ў акупаванай Варшаве, пакутна загінуў у Пальмірах. Узнагародай ягонага імя былі адзначаны м.інш. Барбара Ваховіч, Нікас Хадзінікаляу, Анджэй Мулярчык, Веслаў Охман, Яўген Кабац. Лаўрэатамі з падляшскага ваяводства былі раней Аляксандр Баршчэўскі, Эдвард Рэдлінскі, Уладзімір Паўлючук, Вальдэмар Смашч. Сёлета лаўрэатам Узнагароды імя В. Гулевіча стаў Сцяпан Копа з вёскі Гарадняны пад Клеасінам, музык, фалькларыст, аўтар 8 зборнікаў беларускіх песень з Беласточчыны. Фундатарам узнагароды яму з'яўляецца Анатоль Грышчук, беларускі бізнесмен, родам з Брэста, які пражывае цяпер у Прушкаве, а Маршалкоўская ўправа Падляшскага ваяводства дафінансавала ўрачыстасць у арганізацыйным плане. Вялікую ўзнагароду ўручылі Кардыяну Тарасевічу (101 год), галоўную ўзнагароду — Казімеры Запаловай з Кельцаў, апошнія — Кшыштафу Гаштыле, Войцеху Пятровічу з Вільні, Барбары Наўроцкай-Доньскай, Марыі Ентыс-Барэлёўскай, Яўгену Вальчуку ды Мар'янне Пілёт. У вялікай зале, запоўненай творцамі польскай культуры, дзе традыцыйна патрыятычныя словы перапляталіся з патрыятычнымі песнямі, наш лаўрэат урачыстасць павёў па-свойму: пачаў ад беларускай песні (уручыўшы ўсім сабраным тэкст на лацінцы і заахвоціўшы да супольных спеваў па-беларуску), пасля ляўдацыі прафесара Баршчэўскага таксама не расцягнуў прамовы на трыбуне, дзе, вядома, лаўрэаты часам доўга дзякавалі за ўшанаванне, толькі заспяваў некалькі беларускіх песень, а на канец — свайго аўтарства ў народным стылі (і словы, і музыка Сцяпана Копы) — „Як прыгожа меці жонку". А пасля пачулі мы словы па-польску з Францішка Скарыны, пра тое, „як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць на моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, — так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць".

— Не ведаю, ці чалавек мае душу, але калі мае, то ў выпадку пана Копы, — прамаўляў у час ляўдацыі Аляксандр Баршчэўскі, — гэтай душой ёць беларуская народная песня на Беласточчыне. Выдаў ён восем тамоў, прысвечаных гэтай песні. Такім чынам прылічыўся да прыгожай плеяды стваральнікаў і захавальнікаў культуры як Ян Чачот, які выдаў сем тамоў збораў беларускай „вясьнячай" песні, як Оскар Кольберг, які 52 том „Польскага люду" прысвяціў беларускаму Палессю, як выдатны збіральнік Міхал Федароўскі, аўтар васьмі тамоў „Беларускага люду на Літоўскай Русі". Спадар Копа — чалавек незвычайны. Калі беларуская народная песня мае душу, дык гэтай душой ёсць Сцяпан Копа!

СЛУХАЙ СВАЁ!
БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ
WWW.RACYJA.COM
Дуброва-Беластоцкая, Сакалка, Гарадок, Беласток, Бельск-Падляшскі, Гайнаўка, Чаромха, Сямятычы
98,1 FM
Высокае, Бераставіца, Свісла́ч, Брузгі, Гародня, Ваўкавыск, Шчучын, Масты, Лунна
ПЕРШАЕ ТРАНСГРАНІЧНАЕ БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ
Янаў-Падляшскі, Белая-Падляшская, Тарэспаль, Кодань
99,2 FM
Брэст, Кобрын, Жабінка, Маларыта
Białoruskie Radio Racja
ul. Ciepła 1/7
15-472 Białystok
e-mail: info@racyja.com
tel. (+48) 85 676 80 20

„Ня быць скотам!"

Днямі на адным з расійскіх тэлеканалаў трапіўся мне на вока дакументальны фільм пра Уладзіміра Высоцкага: спярша апавядалі пра барда, а пасля была старая стужка з маналогам і песнямі самога паэта. І неяк абвострана адчулася — наколькі актуальны гэты творчы дысідэнт, нашчадак выхадцаў з Беларусі, і сёння на постсавецкай прасторы, дзе ў пераважнай бальшыні незалежных ужо краін пануюць аўтарытарныя альбо цалкам дыктатарскія таталітарныя рэжымы. Што ні песня Высоцкага — то ў кропку! А ягоны твор „Я не люблю" — сапраўднае крэда кожнага творцы-нонканфарміста.

Беларуская творчая эліта можа ганарыцца тым, што амаль ніхто з найлепшых талентаў нашай краіны не паддаўся спакусе служыць генеральнай „правільнай" лініі, не падаўся ў каламутную ваду фальшывай, фарысейскай ідэалогіі і ўхваленне геніяльнага курсу. З тых, у каго аказаўся надзвычай гнуткі хрыбет, можна прыгадаць хіба толькі аднаго „народнага дырыжора" і аднаго „народнага спевака". Ды яшчэ здольнага некалі публіцыста, які ўзначаліў галоўны друкаваны „орган" дзяржаўнай прапаганды. Словам, лічаныя адзінкі і не больш. Усё астатняе, што прыбілася да ўладнага берага і ўсплыло на паверхню — прыдворныя журналісты, песенная папса, няўклюдныя графаманы і іншыя з'яўнікі эрзац-культуры, якія „высочайшим повелением" аб'яднаныя і згуртаваныя ў рознага кшталту холдынгі і „творчыя саюзы" — не вартае нават малой увагі і тым больш сур'ёзнага абмеркавання.

Уся сапраўдная беларуская літаратура таксама не стала абслугоўваць патрэбы самаабвешчанага „айца нацыі", а захавала гонар, годнасць, а значыць і сапраўдную вартасць. А з рускамоўных пісьменнікаў Беларусі хіба толькі адна Святлана Алексіевіч, ацэненая ў свеце, мае адметны талент і яна таксама ўрэшце зразумела, што дзеецца ў сучаснай Беларусі і выразна выказала сваю пазіцыю.

Нашы творцы ўжо нямала пацярпелі ад цяперашняга антыбеларускага рэжыму. Славамір Адамовіч за вобразны, але радыкальны верш „Убей президента" сядзеў у турме, мастак Алесь Пушкін за свае мастацкія перформансы неаднаразова быў „на сутках" і таксама пад крымінальнай справай, геніяльны паэт Уладзімір Някляеў ледзь не быў забіты ў выніку правакацыі ў час апошніх прэзідэнцкіх выбараў за тое, што наважыўся кінуць выклік недатыкальнай асобе. Пра тое, што сапраўдных творцаў няма ні на экранах тэлевізараў, ні ў эфіры радыё — ужо і не кажу. Пераважная бальшыня беларускамоўных газет і часопісаў ужо зачынена, існуе „чорны спіс" рок-гуртоў і іншых выканаўцаў, якім забаронена выступаць у афіцыйных залах і на вялікіх пляцоўках. Нездарма бальшыня прадстаўнікоў альтэрнатыўнай музыкі змушана зысці ў андэрграўнд. І невыпадкова з'яўляюцца такія творы, як „Ня быць скотам!" Сяргея Міхалка. Гэты рок-маніфест на словы класіка нашай паэзіі Янкі Купалы апальны музыка прадставіў на свет якраз пасля таго, як на яго пачалі крымінальную справу. Досыць просты, але дынамічны хіт хутка заваяваў папулярнасць. Змагацца з творцамі — марная справа для таталітарнай дзяржавы. Ёй жа даражэй абыдзецца. Прыклад таго ж Высоцкага выразна давёў, што праўда і сапраўдная сіла слова ўсё роўна пераможа. Аднак, па-іншаму такая дзяржава рэагаваць не ў стане — знішчальная прырода бярэ сваё.

Днямі дзяржаўны правадыр правёў сустрэчу з „творчаскай маладзёж'ю", праўда, хто яе прадстаўляў, так і не паведамілі. Кіраўнік дзяржавы заклікаў „не змешваць палітыку з мастацтвам і не сварыцца са сваёй краінай, з яе прынцыпамі і ідэаламі". Лейтматыў і падтэкст былі выразны — будзьце з дзяржаўнай ідэалогіяй і будзеце забяспечаны, будзеце жыць спакойна.

У грамадстве ёсць і яшчэ адна катэгорыя творчай інтэлігенцыі — гэта тыя, якія заўсёды „ні пры чым" (зноў паводле Высоцкага). Нядаўна ў адной добрай знаёмай у застаўцы скайпа з'явілася трапнае выслоўе: „Самыя гарачыя месцы ў пекле адведзены тым, хто ў час вялікіх маральных зломаў трымаў нейтралітэт". Хіба што, так яно і будзе...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Рукі апускаюцца

І сталася. Уладзіслава Кавалёва і Зміцера Канавалава прыгаварылі да смяротнага пакарання. Рукі апускаюцца. Незалежна ад таго праваабаронца Людміла Гразнова не паддаецца і намаўляе беларусаў падпісацца пад петыцыяй за адмену нялюдскага прысуду. Каб акцыя аказалася паспяховай, трэба мінімум сотні тысяч подпісаў. «Гэта будзе ратунак не толькі для прыгавораных, але для нас усіх», — адзначыла ў размове з тэлеканалам Белсат. Нельга дапусціць да сябе пачуцця атупляльнай бездапаможнасці.

У Польшчы тым часам заціхла дыскусія над вяртаннем смяротнага пакарання. Нават Яраслаў Качынскі пасля вострага пратэсту касцельных іерархаў набраў вады ў рот. Але ж у мурашнік, а як жа бы іначай, ізноў пырнуў кіем. Быццам у абароне суверэннасці Польшчы, якая апынулася пад пагрозай! Ну, рукі апускаюцца. На жаль, без ПіСу, нават такога, якім яно ёсць, пакуль што не абыдзецца. Не ўфармавалася яшчэ на палітычнай сцэне сіла, роўная яму падтрымкай выбарцаў і вопытам парламенцкай апазіцыі. Роля кожнай апазіцыйнай фармацыі — глядзець уладзе на рукі, таму што мае яна схільнасць хаваць іх пад стол, дзе не відаць, каму яна фактычна совае дулю, хто да каго лашчыцца далонню, хоць па-над сталом размахвае кулаком, а хто пасылае ўсіх на фік. Прытым улада любіць ісці «па цэласці», губляючы па дарозе істотныя дэталі. Дэталлю для яе з'яўляецца адзіночны, нярэдка беспрацоўны грамадзянін, пакінуты сам сабе ў абцугах разрослай адміністрацыі, штораз больш абстрактнага права і бестурботнага правасуддзя. Памятаць, аднак, трэба, што калі прычынай такіх дэфармацый з'яўляюцца занядбанні ўлады, дык гэта таксама вынік занядбанняў палітычных сіл, якія супрацьстаяць ёй. Адной з іх з'яўляецца ПіС. Наколькі аднак яно выказвае клопат за грамадзяніна, а наколькі «ўжывае» яго для сваіх партыкулярных інтарэсаў? Задалёка, аднак, на маю думку, ПіС ідзе, калі талковыя намеры міністра Сікорскага, які заклікаў да больш шчыльнай інтэграцыі краін Еўрасаюза, націскаючы адначасова на Нямеччыну, каб больш увайшла ў гэты працэс, жорстка пераназывае іх дзяржаўнай здрадай. Што больш, абвінавачвае польскі ўрад у самаадмаўленні ад суверэннасці і каб паставіць гэта як бясспрэчны факт, склікае на 11 снежня патрыятычнае веча ў абарону непадлегласці Польшчы. Дакладна месяц пасля лістападаўскіх аванцюр. На два дні перад гадавінай ваеннага становішча. Рукі апускаюцца.

Суверэннасць дзяржавы заўсёды ставіцца вышэй над грамадзянскую суверэннасць. Ці ў Польшчы яна нейкім чынам апынулася пад пагрозай? Калі так, дык для таго маюцца Сейм, тэлебачанне, прэса, — каб правесці ў іх публічную дэбату аб абавязках дзяржавы. ПіСу, аднак, выгадней разважаць аб гэтым на вуліцы. Карыстаецца яно прытым каварным аргументам: калі 13 снежня Ярузельскі аб'яўляў вайну сваім суграмадзянам, таксама спасылаўся на пагрозу для суверэнітэту краіны. А прытым размахваў лозунгамі патрыятызму, айчыны, грамадзянскага абавязку з не меншай гатоўнасцю, чым Яраслаў Качынскі цяпер. Толькі што першы зрабіў з іх шчыты, з-за якіх біў кулямётнымі чэргамі ў суверэннасць грамадзян. А цяпер у што цаляе гэты другі?

У Польшчы ваеннае становішча гэта ўжо гісторыя; у Беларусі яно ўвесь час адбываецца. Хітра і паціху выпаўзае з нахабных законаў і прэзідэнцкіх указаў. Не без удзелу беларускага КДБ. Яе выканаўчыя прэрагатывы, якія расшырыла тайная інструкцыя Аляксандра Лукашэнкі, дэ-факта дазваляюць гебістам на яўны тэрор у адносінах да непакорлівых. Калі абмяжоўваюцца грамадзянскія правы, цэнзуруюцца СМІ, душыцца свабода выказванняў, напрыклад, у інтэрнэце, а палітычных праціўнікаў па абы-якой прычыне саджаюць у турму, гэта відавочны знак, што такая дзяржава суверэнам не з'яўляецца. Што стала яна заложнікам або якогась палітычнага адхілення, або нахабнага аўтакратызму, або варожай агентуры. Даючы генеральскія званні губернатарам рэгіёнаў, Аляксандр Лукашэнка па сутнасці ваенізаваў усю беларускую адміністрацыю. Не абышлося без сакрэтнага калупання пры законе «Аб змаганні з карупцыяй». Яе перагледжаны змест дасць магчымасць чыноўнікам прыняць на працу сваякоў як падуладных. Так плаціцца за вернасць прэтарыянцаў, апярэджваючы закон. А для кесара не праблема, каб устанавіць новы. Ну, блінок, рукі апускаюцца! Абы толькі не ўсім! І не з усім. Спадарыня Людміла, я з вамі!

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Еўрасаюз на рамонт

Нядаўняя прамова міністра замежных спраў Радаслава Сікорскага ў Берліне выклікала шмат рознагалосся. У Польшчы частка апазіцыі стала крычаць аб спробе замаху на суверэннасць нашай краіны і пераконваць, што тэзісы, змешчаныя ў прамове ў першую чаргу павінны быць абмеркаваны на радзіме, а прэзідэнт Браніслаў Камароўскі меў жаль, што міністр не скансультаваў з ім свайго выступлення, бо ж ён таксама адказвае за замежную палітыку. Адна з публічных тэлестанцый за пасрэдніцтвам верагоднага даследчага цэнтра рашыла нават разведаць г.зв. грамадскую думку. Аказалася, што адрозненне паміж прыхільнікамі і праціўнікамі канцэпцыі міністра Сікорскага — вельмі невялікае. Падтаквае яму 37% апытваных, 35% мае іншую думку, 28% сваёй думкі на гэтую тэму не мела. Калі я прачытаў тыя вынікі і паслухаў разнастайных выказванняў на гэтую тэму, мне здалося, што грамадская думка не ацэньвае самога выступлення кіраўніка МЗС, а кіруецца адчуваннямі, якія перадаюцца ёй СМІ і ўдзельнікамі польскай палітычнай сцэны. Таму я заглянуў у тую прамову. Перш за ўсё кінуўся мне ў вочы сказ: „Не быў ён выкліканы [крызіс — М. Х.] — як некаторыя намякаюць — расшырэннем [Еўрасаюза — М. Х.]". Далей я ўчытваўся ў канкрэтныя прапановы, якія Радаслаў Сікорскі накіраваў Еўрасаюзу. На думку міністра, „патрэбны ўстановы, працэдуры, санкцыі, якія пераканаюць інвестараў, што краіны змогуць жыць у межах магчымасцей, а затым што аблігацыі, якія купяць, будуць сплачаны, найлепш з сумленным працэнтам". Далей папракаў м.інш.: „Маем у Еўропе дамінуючую валюту, на варце якой не стаіць ніякае еўрапейскае Міністэрства скарбу. Маем супольныя межы без супольнай міграцыйнай палітыкі. Маем быццам бы супольную замежную палітыку, але яна пазбаўлена рэальных інструментаў улады і часта аслабляюць яе членскія дзяржавы, якія наладжваць свае ўласныя інтарэсы". У далейшай частцы прагучаў пагрозлівы сказ: „Калі мы не гатовы зарызыкаваць частковым дэмантажам ЕС, дык тады станем перад найцяжэйшым для кожнай федэрацыі выбарам: глыбейшая інтэграцыя або распад". Пасля дадаў: „Неадкладнай справай з'яўляецца выратаванне еўра. Зрабіўшы захады, важным ёсць, каб мы захавалі Еўропу як дэмакратыю, якая ўшаноўвае аўтаномію яе членскіх дзяржаў". І запрапанаваў: „Краіны, якія падлягаюць працэдуры празмернага бюджэтнага дэфіцыту, мусілі б прадставіць свае краёвыя бюджэты Еўрапейскай камісіі для адабрэння". (...) „Еўрапейскі цэнтральны банк павінен стаць крэдыторам апошняга шанцу" . (...) „Еўрапейская камісія павінна быць меншай, каб быць эфектыўнай" . (...) „Некаторыя члены Еўрапарламента маглі б быць выбранымі з агульнаеўрапейскага спіса кандыдатаў" . (...) „Парламент павінен мець сядзібу ў адным месцы" . (...) „Мы маглі б спалучыць пасады старшынь Еўрапейскай рады і Еўрапейскай камісіі" . (...) „Ёсць важным каб мы забяспечылі ўзгодненасць паміж зонай еўра і ўсім ЕС". Адзін са сказаў звярнуў маю асаблівую ўвагу, у кантэксце дыскусіі, якая разгарэлася ў Польшчы пасля берлінскай прамовы: „Чым больш улады і легітымнасці перадамо федэральным установам, тым членскія дзяржавы павінны больш умацавацца ў перакананасці, што некаторыя прэрагатывы такія, як шырока пастаўленыя пытанні нацыянальнай тоеснасці, рэлігіі, стылю жыцця, публічнай маральнасці ды ставак падаходнага падатку і ПДВ павінны назаўжды застацца ў кампетэнцыі дзяржаў". На маю думку, міністр Сікорскі стаў ініцыятарам дэбаты (не толькі ў Польшчы) аб новым кшталце ЕС. І хочам таго ці не — Еўрасаюз мусіць змяніцца.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

VII „Падляшша ў аб’ектыве”

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Сабраныя 25 лістапада ў музеі на падвядзенні вынікаў VII Фатаграфічнага конкурсу „Падляшша ў аб’ектыве”, які ладзіць Аб’яднанне „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы”, захапляліся прыгожасцю здымкаў, якія даслалі на конкурс жыхары Гайнаўшчыны ды іншых рэгіёнаў Падляшша і Польшчы. Мае суразмоўцы гаварылі, што ўзровень сёлетняга конкурсу самы высокі ў параўнанні з папярэднімі. Сабраных уразіла таксама экспрэсія і разнароднасць дасланых прац. Жыхары Беластока, якія першы раз прынялі ўдзел у конкурсе, сказалі мне, што будуць намаўляць іншых аматараў фатаграфіі прыняць удзел у гайнаўскім спаборніцтве. У гэтым годзе на конкурс паступіла 146 здымкаў ад 51 аўтара.

Сярод фатаграфій, прэзентаваных на конкурснай выстаўцы, вылучаліся, між іншым, партрэты мясцовых беларусаў і многа цікавых месцаў, дзе кампактна пражываюць беларусы.

— Падляшша характэрнае ўнікальнай прыродай, шматкультурнасцю, рознымі веравызнаннямі, драўлянай вёскай і добрымі людзьмі. Гэта ўдзячны аб’ект для фатаграфавання. Тут вялікія магчымасці паказаць свае ўмеласці, майстэрства і ўражлівасць назірання. Фотаконкурс „Падляшша ў аб’ектыве” несумненна спрыяе зберажэнню нашай культурнай і прыроднай спадчыны. Гэта таксама запіс таго, што на Падляшшы прамінае або ўжо адышло ў нябыт, — лічыць дырэктар Беларускага музея Тамаш Ціханюк. — VII выпуск — самы лепшы ў гісторыі нашага конкурсу, калі ўзяць пад увагу ўзровень дасланых здымкаў, іх разнароднасць і колькасць удзельнікаў.

Арганізатарам фатаграфічнага мерапрыемства ўдалося знайсці спонсараў, сярод якіх галоўнымі былі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ды Гарадская ўправа Гайнаўкі. Гэта дазволіла ім купіць вартасныя ўзнагароды. Да ўдзелу ў спаборніцтве прыцягнулі таксама прозвішчы членаў конкурснай камісіі, вядомых у Польшчы фатографаў Віктара Волкава, Бажэны Валенцік і Яраслава Хыры. Бурмістр Гайнаўкі Ежы Сірак таксама звярнуў увагу на высокі ўзровень дасланых фатаграфій. Лічыць ён мерапрыемства, якое адбылося ў рамках святкавання 60-годдзя прысваення Гайнаўцы гарадскіх правоў (канкрэтна ў рамках праекта „Прыгранічны этнічны альянс”), удалай прамоцыяй прыпушчанскага горада як на Падляшшы, так і ў Польшчы.

— Няма такога вялікага аб’ектыва, які ахапіў бы ўсю разнастайнасць Падляшша і таму перад конкурсам стаяць неабмежаваныя магчымасці развіцця. А тое, што ён развіваецца, відаць хаця б па ліку ўдзельнікаў і колькасці прац. Штораз большая папулярнасць фатаграванння гэта шанц на тое, што ўсё больш і больш здольных людзей гляне на Падляшша праз аб’ектыў. Няхай нашай мясцовай задачай будзе вылавіць сярод іх сапраўдныя таленты, здольных фатографаў, якія не патрабуюць вялікага аб’ектыва, каб у адным кадры змясціць прыгожасць Падляшша, — лічыць член конкурснай камісіі Яраслаў Хыра. — Мы ўсе павінны скрыжаваць пальцы за арганізатараў конкурсу так, каб пасля чарговых гадоў з гордасцю заявіць, што ў Гайнаўцы ёсць падзея з багатай шматгадовай традыцыяй.

На 51 удзельніка конкурсу выдатную большасць складалі фатографы-аматары з Падляшша, у тым ліку 12 асоб з Гайнаўкі і 12 з Беластока. Цікавыя здымкі даслалі фатографы з Белавежы, Бельска-Падляшскага, Нараўчанскай, Нарваўскай, Арлянскай і іншых гмін паўднёвага Падляшша. Першае месца заняў, на жаль непрысутны ў час конкурснага мерапрыемства, Тамаш Паскробка з Беластока, які зрабіў вельмі цікавыя здымкі ў час багаслужбаў у беластоцкіх цэрквах і на Грабарцы. Вялікая вартасць яго здымкаў заключаецца перш за ўсё ў непаўторных кадрах і цікавым асвятленні, калі адпаведнае святло стварыла выяву анёла над свечкай, а каплічка з прыздабленнем — крылы для жанчыны, што стаіць каля дрэва і моліцца. Другое месца занялі Адам Панфілюк з Гайнаўкі і Януш Хайнацкі са Старога Сонча (таксама непрысутны ў час раздачы ўзнагарод).

— Я раблю здымкі здаўна, але больш інтэнсіўна ад шасці гадоў. Фатаграфую перш за ўсё прыроду, у галоўным Белавежскую пушчу. Даслаў я на конкурс здымкі пушчы і яе бліжэйшага наваколля, бо ж гэта найстарэйшы і самы прыгожы ў Еўропе лес. Перамогі на конкурсе можна дабіцца толькі тады, калі ўдасца зрабіць непаўторны, цікавы кадр, які загадзя трэба абдумаць у галаве. Канешне, самае важнае на здымках святло. Напрыклад, зуброў найлепш фатаграфаваць, калі ўсходзіць або заходзіць сонца, — сказаў Адам Панфілюк, які першы раз прыняў удзел у конкурсе. Менавіта ягоны здымак зуброў на фоне гайнаўскага прадпрыемства з задымленымі комінамі зрабіў на камісіі вельмі вялікае ўражанне. Пацвердзіць гэтае пазней у размове Бажэна Валенцік, якая таксама фатаграфуе пушчу, пражываючы ў Тэрэмісках. Іншыя цікавыя здымкі Адама Панфілюка — гэта кадр са спакойнай савой, якая не прадбачвае ніякай небяспекі, і прыгожая Белавежская пушча.

— Многа здымкаў вылучаецца высокім мастацкім узроўнем. Мы мусілі доўга разглядаць здымкі, каб выбраць самыя найлепшыя. Некалькі разоў перакладалі іх з месца на месца, пакуль не рашыліся каму прысвоіць першае, другія, трэція месцы і вылучэнні. Усе фатаграфіі, прэзентаваныя на выстаўцы, на свой спосаб цікавыя і зробленыя на прыстойным тэхнічным узроўні, — сказала Бажэна Валенцік. — Я асабліва віншую маладых людзей, што ўмеюць выбіраць для фатаграфавання цікавыя месцы на Падляшшы. Напрыклад, пераможныя здымкі, зробленыя ў цэрквах, паказваюць асаблівы таямнічы клімат, а тыя з прыродай, непаўторны выгляд пушчы і іншых месцаў на Падляшшы.

Януш Хайнацкі атрымаў другое месца за цікава апрацаваныя з дапамогай праграмы фаташоп фатаграфіі краявідаў у скансэне ў Сухой (такой тэхнікай пакарысталіся тры ўдзельнікі конкурсу). Трэція месцы занялі Анна Тамаровіч са Старога Масева (уражаюць краявіды са старой вярбой і стогам) і Яцак Земба з Астралэнкі (вельмі цікавы кадр з зубром на полі паміж Дубінамі і Навасадамі). Вылучэнні атрымалі Пётр Свідэрскі з Бельска-Падляшскага (цікавыя партрэты людзей) ды Казімеж Янкоўскі і Павел Тадэйка з Беластока.

— У мяне вельмі станоўчыя ўражанні ад конкурснай выстаўкі. Фатаграфуючы Падляшша, аўтары ўмела вышукалі характэрныя нашаму рэгіёну месцы і аб’екты. Можна ж на фатаграфіях убачыць нашае праваслаўе, якім моцна захапляюцца прыезджыя, ці прыгожую пушчу. А ёсць у нас і чым іншым пахваліцца. Па конкурсных здымках людзі будуць знаёміцца з прыгожасцю нашай прыроды, ці з матывамі праваслаўя, — гаварыў былы настаўнік Гайнаўскага белліцэя Васіль Сакоўскі.

— Карыстаючыся самымі лепшымі фатаграфіямі мы выдалі альбом, які падводзіць вынікі нашай шасцігадовай працы, — сказаў дырэктар Беларускага музея Тамш Ціханюк. — Няхай конкурс развіваецца і выконвае ўсе свае задачы.

Пераможцам конкурсу стаў Тамаш Паскробка з Беластока, які даслаў здымкі з беластоцкіх цэркваў і Грабаркі (здымкі справа), другое месца заняў Адам Панфілюк з Гайнаўкі (здымкі злева)

Вынікі конкурсу падвялі і ўручылі ўзнагароды (злева) дырэктар Тамаш Ціханюк, працаўніца музея Агнешка Ціханюк і член конкурснай камісіі Бажэна Валенцік

Успамін Беларусі

Вядомы ў Ольштыне беларусіст прафесар Мечыслаў Яцкевіч запрасіў сваіх сяброў у паездку ў Беларусь. Паехалі ўлетку на машыне Эдмунда Вайноўскага, які мне пра гэтае падарожжа і расказаў.

На пагранпераходзе ў Друскеніках нас ветліва прывіталі пагранічнікі, праверылі пашпарты і пажадалі прыемнай экскурсіі па Беларусі. Па прыгожым Панямонні заехалі ў Гродна, чысты і задбаны горад, поўны зелені. Пасля паехалі ў Ліду. Дарогі ў Беларусі вельмі добрыя, можна каціцца. Затрымалі нас міліцыянеры, прафесар Яцкевіч пагутарыў з імі на чыстай беларускай мове, а яны, развітваючыся, пажадалі нам шчаслівай дарогі. З Ліды паехалі ў Наваградак, дзе адпачывалі ў гасцініцы — усюды чыста, мілы персанал. Наступнага дня паехалі цераз Трабы і Гальшаны ў Ашмяны — вакол абкошаныя палі, духмянае паветра. У Ашмянах пагутарылі крыху з жыхарамі; яны хвалілі Лукашэнку, што добры ён гаспадар. У Астраўцы сустрэліся з прафесарам Адамам Мальдзісам і з журналісткаю „Астравецкай праўды" Ганнай Чакур. Пагасцяваўшы там і пераначаваўшы заехалі ў прыгожую Вільню Чэслава Мілаша. Былі ў Свіры, пабачылі возера Нарач з яго шчабятлівым птаствам. Пабывалі таксама ў Вілейцы, маляўніча распаложанай на рацэ Віліі. На працягу двух тыдняў праехалі паўтары тысячы кіламетраў. Сябрам прафесара ўсё ў Беларусі падабалася: чыстыя гарады, шырокія гладкія дарогі, пакошаныя сенажаці ды парадак на палях. На наступны год плануюць яны зноў праехацца па Беларусі, наведаць Мінск, Бабруйск, Віцебск, Гомель, Мазыр, Давыд-Гарадок, Пінск і Брэст — абы толькі здароўе дазволіла.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Закон аб смецці

З пачаткам студзеня ўводзіцца новы закон аб гаспадарцы нечыстотамі. Дагэтуль абавязак заключэння з камунальным прадпрыемствам дамовы на вываз бытавых адходаў спачываў на ўладальніках сядзіб, г.зн. на гаспадарах. Зараз абавязак пяройдуць самаўрады. Практычна будзе выглядаць гэта так, што ў час таргоў гміна вылучыць фірму, якая зоймецца вывазам нечыстотаў, дамовіцца з паслугадаўцам наконт платы, затым будзе заключаць дамовы з паасобнымі гаспадарамі. Якімі крытэрыямі пакарыстаецца Рада гміны для ўстанаўлення ставак для жыхароў, цяжка прадбачыць. Ці гэта будзе стаўка „ад коміна", ці ад колькасці жыхароў у кватэры або колькасці вывезенага смецця — вырашаць дэпутаты. Для прывучэння да новых правілаў самаўрады маюць паўтарагадовы тэрмін, г.зн. да 30 чэрвеня 2013 года. Затым закон уступіць у сілу. Паводле новых правілаў гміна можа патрабаваць ад уладальніка сядзібы дакумента, якім гэты абавязаны будзе даказаць, што робіць з адходамі на сваім панадворку. Калі гэтага не дакажа, яго аштрафуюць.

Папраўка

У 49 нумары „Нівы" ад 4 снежня ў тэксце „У Дубіцкай гміне" я дапусціў памылку. Памылкова напісаў прозвішча сакратара Гміннай управы — „Ляўчук", калі ў сапраўднасці павінна быць ЛАЎРЫНОВІЧ. За памылку прашу прабачэння ў спадара Мікалая Лаўрыновіча, чытачоў і рэдакцыі.

Уладзімір СІДАРУК

Аўтавакзал у Цеханоўцы

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Аўтобусныя манеўры

Век вучыся, а і так дурнем памрэш, — гаворыць народная мудрасць. Яе правільнасць спазнаў я ў чарговы раз, выбіраючыся ў падарожжа ў Мельнік. Здавалася б, што з цэнтра ваяводства ў гмінную мясцовасць, нават крайнюю, павінен быць нейкі дзённы доступ з дапамогай публічнай камунікацыі. Так яно было і ў выпадку крайняга з паўднёвага напрамку Мельніка, а мне ў галаву неяк не захацела прыйсці падазронасць, што такое можа змяніцца, што камунікацыйны масток можа з ходам часу парвацца-паламацца. У Мельнік „ад заўсёды" адпраўляўся з Сямятыч аўтобус у дзевяць гадзін раніцы і я з упэўненасцю разлічваў на яго. Заехаў я ў Сямятычы за дваццаць мінут да дзевятай і ўжо хацеў правесці той час на прывакзальным базарыку. Калі праходзіў каля вялікага зашклёнага табло з раскладам сямятыцкіх аўтобусаў, пабачыў перад ім маладзіцу, якая ногцямі здзірала шэрань з намерзлай там шыбы...

Чалавек часам пагардліва гаворыць пра курыны розум, але і сам ён часам карыстаецца гэтым атрыбутам нашай аперанай радні па эвалюцыі. Вось так жа, як і курыца, убачыўшы іншую разграбаючую нешта, бяжыць у тое ж месца, каб і сабе нешта выграбці, так і я пацягнуўся паграбці тую намерзлую на шыбе шэрань. І пабачыў, што таго аўтобуса ў Мельнік, які быў „ад заўсёды", на раскладзе язды няма. Не было яго і на раскладзе ў пачакальні, і на адпраўным пероне. Значыць, — кануў ён мне. А ў Мельнік з Сямятыч каля дваццаці кіламетраў — чатыры гадзіны хады. Да таго ж за тыя чатыры гадзіны і аўтобус быў бы ў Мельнік, але не было б транспарту вярнуцца адтуль, таму рашыў я вяртацца з Сямятыч...

Нейкія два тыдні раней у Сямятычы вяртаўся я з Драгічына на аўтобусе саколаўскага пэкаэсу. Усё было прыстойна амаль да канца падарожжа. Амаль, бо на канцавы прыпынак той саколаўскі аўтобус не заехаў на сямятыцкі аўтобусны вакзал, толькі, на здзіў пасажырам, зрабіўшы вакол яго круг, спыніўся на вулічным прыпынку насупраць пачакальні. Раней усе аўтобусы, у тым і саколаўскія, заязджалі на вакзальную плошчу. Праўда, на ёй чакаў свайго ад'езду лосіцкі, „чужы", аўтобус. Сітуацыя нагадала мне разборкі паміж нашымі футбольнымі фанатамі, паміж якімі бываюць не толькі войны, але і „дружбы". Відаць, у аўтобуснага кіраўніцтва вельмі падобныя паводзіны, адно толькі ў той жа сам час у Саколаве-Падляшскім сямятыцкі аўтобус ад свайго перона адчужаны не быў. Мабыць, кіраўніцтва сямятыцкага пэкаэсу ўступіла ў змаганне за пасажыраў гэтакім чынам, спіхаючы канкурэнцыю на абочыну. Толькі тым пасажырам цяпер не надта вядома, з якога месца ў горадзе адпраўляцца ў сваё падарожжа. А львінай доляй пасажыраў аўтобуснага транспарту цяпер становіцца старэйшае, ужо нямоглае пакаленне, якому гэтае „змаганне за іх" з'яўляецца чарговай калодай пад знямоглыя ногі. Пару тыдняў раней я ў гэтым месцы здзіўляўся, што ў Цеханоўцы бельскія аўтобусы маюць свой перон не на тамашнім аўтобусным вакзале, толькі на заправачнай станцыі; відаць і там таксама ідзе „змаганне за пасажыраў". Адно толькі на сямятыцкім вакзале было шмат мясцовых аўтобусаў, якія, не едучы ў сваё дэпо, займалі месца іншым, затое цехановецкі аўтобусны вакзал амаль пустуе, зарастаючы паволі пустазельнай травіцай, а вялікая павець над перонамі вельмі нагадвае пусты майскі абарог, быццам у чаканні той пустазельнай травіцы пад ягоную страху...

З Сямятыч у Беласток пазначана адпраўка аўтобуса пяць мінут пасля дзевятай. Маючы крышку часу, глянуў я на той прыпынак, на які раней быў прывёз мяне згаданы ўжо саколаўскі аўтобус. На ім чакалі два мікробусы, адзін з Саколава. А другі, з варшаўскай рэгістрацыяй, меў метку „PKS Wschód", а за пярэдняй шыбай таблічку, што ён у Беласток. Зайшоў я ў салон, папрасіў білет. Вадзіцель спытаў мяне які білет: нармальны? У выніку высветлілася, што маю права на льготу...

Калісь, у перыяд г.зв. камуны, льготамі карысталася шмат рознага народу. Пасля львіную долю гэтых льгот скасавалі, але цяпер, каб прыцягнуць пасажыраў, транспартныя фірмы ўводзяць свае льготы, але вельмі сарамліва і селектыўна. Рассакрэчу апошнюю фразу шырэй. Сарамліва, бо наогул няма пра тыя льготы наяўнай інфармацыі. Калі пасажыр ведае пра льготу, тады ёю карыстаецца, а калі не ведае, тады карыстаецца тою „льготай" сама дабрадзейная транспартная фірма; вывешак пра фірмавыя льготы ў аўтобусах у прынцыпе няма. Ну а селектыўнасць абазначае льготы на тых маршрутах, дзе дзейнічае канкурэнцыя. Для прыкладу, у Саколку аўтобусны білет прыблізна ўдвая таннейшы, чым у столькі ж адлеглыя Крынкі, а ў Гайнаўку таксама большменш удвая таннейшы, чым у столькі ж адлеглыя Лешукі. Бо ў гарады ездзіць канкурэнцыя і цану трэба збіваць, а затраты можна „адбіць" на вясковым насельніцтве — такая ўжо мужыцкая доля. А калі не ўдаецца зарабіць на мужыках, тады ім папросту не даюць транспарту; мабыць таму скасавалі „мой" аўтобус у Мельнік. Пабылі пры Герку мужыкі панамі, а цяпер зноў настаў час вяртацца да сваёй традыцыйнай мужыцкай долі.

Злазячы ў Беластоку з „усходняга" аўтобуса, пацікавіўся я, з якога прыпынку ён адправіцца назад, бадай у Белую-Падляшскую; ад'язджае ён яшчэ з аўтавакзальных перонаў, як і іншыя пэкаэсаўскія машыны. У Беласток, як і ў Бельск, сямятыцкая выдумка яшчэ не дайшла.

Хуліганы руйнуюць лавачкі

На прыпынках аўтобусаў гарадскога транспарту ў Беластоку стаяць пераважна новыя лавачкі, а над імі дашкі. Добра прысесці на іх, калі прыходзіцца чакаць „свайго" аўтобуса. Цяпер за сценкамі дашкоў можна схавацца ад халоднага лістападаўскага ветру.

Шкада, што не ўсе шануюць супольную маёмасць — вось хаця б тыя лавачкі ды дашкі. Хуліганы паламалі ды разбілі іх на аўтобусных гарадскіх прыпынках каля скрыжавання вуліц Сянкевіча і Рыжскай, на вуліцы Браніцкага ды на апошнім аўтобусным прыпынку на вуліцы 27 Ліпеня, ля былой цяплiцы. Адкуль такі здзек на лачачках? Яны ж — выгада для старэйшых людзей. А ў сваю чаргу час і пара ўзяцца за ўцізхаміранне вандалаў. Чаму няма пешых патруляў паліцыі? Супольнае дабро неабходна зберагаць!

(яц)

Адгалоскі

Аб нямецкай меншасці

Тыднёвік „Не" („Nie") у нумары ад 11-27.10.2011 г. змясціў вельмі цікавую размову з нававыбраным дэпутатам у Сейм ад нямецкай меншасці (пражывае ў Аполі і Апольскім ваяводстве) — Рышардам Галлям. Немцы здабылі ў апошніх выбарах 1 мандат (хоць у 1991 г. мелі 7, у 1993 — 4, потым па 2). На пытанне, чаму немцы не галасавалі на сваіх, сказаў: супраць ПіС, большасць галасавала на Грамадзянскую платформу. Далей чытаем, што нямецкая меншасць (як і ўсе іншыя) не мае гарантаванага месца ў нашым парламенце, хоць часам так гаворыцца. Нямецкая меншасць мае свой выбарчы камітэт і як адзначыў дэпутат, „трываем і трымаемся моцна". Аб іншых меншасцях польскія немцы таксам ведаюць нямала. Р. Галля называе дэпутатаў мінулага тэрміну — ад украінцаў Мірона Сыча (выбраны ад ГП) і Яўгена Чыквіна (выбраны ад СЛД).

Аб сітуацыі немцаў у Польшчы пасля вайны дэтутат Р. Галля сказаў: *Po wojnie to były po prostu wypędzenia i wysiedlenia, byliśmy poddani polonizacji, zakazany był język niemiecki, nawet gwara śląska.*

(bb)

На гадзінніку выбіла поўнач. У пачакальні, стылізаванай пад панскі палац, прыаздобленай штучнымі пальмамі, усе крэслы былі заняты. Хто драмаў, хто вёў між сабой сцішаную гутарку, хто яшчэ ўзіраўся на дзверы з надзеяй, што з'явіцца знаёмы, сваяк, прыйдзе хто самавіты або дурны і развее нудоту ночы. Разам з дарослымі выседжвалі дзеці, падлеткі, старэчы. У кутку, ля ўваходу, дзяжурыў стомлены паліцыянт. Ён час ад часу падымаўся з месца, абыходзіў кругом пальму, пасля ішоў да прылаўка з ядой і напоямі, браў штосьці „на зуб" ды зноў вяртаўся на сваё месца. Не адрэагаваў, калі Д. сфатаграфавала мяне з ашчэранымі зубкамі пад пальмай.

http://www.karpacki.strazgraniczna.pl

Ганна КАНДРАЦЮК

Белы конь і нелегальныя папяроскі (6)

Чыгуначны вакзал у Ковелі вядомы мне здаўна. У савецкі час горад выконваў ролю камунікацыйнага вузла. У наваколлі вакзалаў дзень і ноч бурліла жыццё, перамяшчалася еўропа і азія. Найбольш спакушаў элегантны рэстаран, дзе прапанавалі духмяны ўкраінскі боршч і гарэлку ў крыштальных графінах. Хоць больш уражвалі мясцовыя індывіды, якія самотна выседжвалі ля крыштальных графінаў і перапоўненым настальгіяй зрокам спазіралі на пасажыраў з далёкага і экзатычнага свету. Сярод іх былі „онукі" Лесі Украінкі (народнай паэткі, родам ад Ковеля), „лепшыя сябры" Гарбачова, „асабісты лекар" Юшчанкі...

У гэтую ноч рэстаран не працаваў. Усюды пазяхала стомленасць, прыгнёт і падазронасць. Гэты настрой папхнуў нас у дзікі бок жыцця. Мы ўсю ноч таўкліся па чужых людзях і месцах, без толку і патрэбы, наступаючы на хвост усякім паталогіям.

* * *

Спачатку мы вырашылі падчакаць „варшаўскі" цягнік і дабрацца на ім у Люблін. Білет каштаваў пяць разоў больш, чым у прыкардонны горад Ягадзін. Ці гэта прыродная скупасць, ці натуральная патрэба досведу папхнула нас ехаць у Ягадзін.

У купэ прывітала нас Люба з Сарнаў. З начной сустрэчы запамятаўся яе азадак, блузка з залатой ніткай і лапці, вышываныя ў залатыя ромбікі. У Любы не было выгляду. Яна хутчэй напамінала цёплую страву, ужо не духмяную і яшчэ не халодную.

— А вы можа гаспадынькай у Польшчы падзарабляеце? — спытала я. — Ці можа прыбіральшчыцай?

http://www.karpacki.strazgraniczna.pl

Папраўдзе ніякая вядомая прафесія не прыставала да гэтай жанчыны.

— А вы то хто такія будзеце? — адказала яна пытаннем на пытанне.

І давай пытаць пра ўсё на свеце, значыць, пра тое, дзе былі, што там бачылі, што сабе купілі. І колькі нам гадоў, якая сям'я, якія зацікаўленні... У тым часе залезла яна на вышкі і пачала дабываць папяроскі з паласатай торбы.

— *Дзівчата, подайтэ шчэ тую торбу*, — спачатку папрасіла, а пасля стала даваць загады быццам начальнік.

— *Дай тую сіню! Ны, тую, шчо під вікном. А ты можэ курыш? Ны — то добрэ. Подай шчэ тую рыжу...*

Цягам наступных трыццаці хвілін, як вавёрка, Люба скакала па вышках і запіхала папяроскі ў шчыліны і дзіркі, непрыкметныя для звычайнага вока. Здавалася, дзе яна дакранецца, там расчыняецца сцяна, адкрываецца схоў, робіцца дзірка. Калі ўрэшце залезла ў дзірку пад столлю, унізе тырчэлі адны яе вышываныя залатой ніткай лапці. Здавалася, усім нам будзе капец. Рассыплецца ў трэскі вагон, паломіцца Люба, а мы, як мімавольныя сведкі здарэння, застанемся з гурбай нелегальных паяпяросак і звычайна за іх *бэкнем...*

Нічога падобнага не адбылося. Люба паспела на час разлажыць свае папяроскі, мусіць пачак пяцьсот, злезла ўніз, паправіла прычоску і быццам нічога ў купэ не адбылося і не хавалася, вярнулася да старой гутаркі. Давай пытаць нас пра манастыр у Пачаеве, каб у канцы канцоў паставіць нам фундаментальнае пытанне:

— *А вы ў споведзі былі?!*

* * *

Праваднiца, класічная саветка, ад пачатку ўзяла нас пад нагляд і канвой. Яна як апараная прылятала ў купэ і напамінала, каб выматвалі ў сваім Ягадзіне.

— Завязіце нас хоць на мяжу, — прасіліся мы.

— Нельзя, нельзя!

Каб канчаткова згубіць нас з вачэй, яна паслала нас прасіць ласкі ў польскі вагон, да важнага Пана З. Той аглянуў нас з галавы да пят і моўчкі адвярнуўся задам. У тым часе ў яго купэ забегла жанчынка, і раз-раз пазасоўвала свае папяроскі ў вядомыя сабе дзіркі і сховы.

— Chodź tu do mnie, Wala, — кінуўся на яе Пан З. Ён прыціснуў дзеўку жыватом да дзвярэй і, здавалася, згвалтуе яе на вачах пасажыраў, значыць нас з Д. Калі спрытнай Валі пашанцавала вырвацца з нялюбых абдымкаў сатрапа Пана З., той, разахвочаны, сляпіцай прыскочыў да Машы, якая майстравала ў калідоры пры ручцы з надпісам „Hamulec bezpieczeństwa". Маша таксама шпурнула на зямлю адкручаны ўжо аварыйны тормаз і з піскам паляцела ў сваё купэ. У расхрыстаных дзвярах вырас, быццам гара, асілак у майцы без рукавоў з напятымі мышцамі.

Пан З. не звяртаў на нас ніякай увагі і мы непрыкметна пакінулі варшаўскі цягнік. Якраз затармазіў ён са скрыпам у славутым Ягадзіне. Там прывітала нас егіпецкая цемра і брутальныя разборкі. Лаянка даносілася ад рэстарана „Кіеў", прыаздобленага ў калядныя дэкоры з каляровых лямпак.

(працяг будзе)

Слуцкі збройны чын

26 лістапада адбылася імпрэза, прысвечаная Слуцкаму збройнаму чыну — Дню Герояў. Старшыня ТБК Хведар Нюнька зачытаў адмысловы зварот да беларусаў свету старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы адзначыць вялікую падзею ў гісторыі Беларусі — збройнае паўстанне ў Слуцку супроць бальшавіцкай акупацыі Беларусі, ушанаваць памяць пра беларускіх змагароў у 1920 годзе.

Затым быў паказаны дакументальны фільм, дзе былі сябра Рады ТБК Валеры Місюк, на жаль трагічна загінуўшы, падрабязна распавёў пра ход Слуцкага паўстання.

Хведар Нюнька паказаў прысутным фотаздымкі помніка-капліцы на беларускіх могілках Мельбурна, дзе намаганнямі аўстралійскіх беларусаў 35 гадоў таму, у гонар Дня Герояў, была пабудавана капліца з надпісам „На вечны ўспамін спачылых усіх ведамых і няведамых беларусаў". Гэта пакуль адзіная ў свеце такая капліца загінуўшым беларусам. Выказваем удзячнасць аўстралійскім беларусам.

На імпрэзе з прамоваю выступіў старшыня грамадскага і палітычнага прадстаўніцтва Беларусі ў Літве Алег Мяцеліца, каардынатар выбарчага штаба кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Уладзіміра Някляева. Ён распавёў пра дзейнасць і планы арганізацыі . Дамовіліся аб цесным супрацоўніцтве з беларусамі Літвы ў акцыях за дэмакратызацыю і свабоду ў Беларусі.

Старшыня ТБК коратка распавёў пра юбілей віднага беларускага дзеяча ў міжваенны час у Вільні Янкі Багдановіча, рэдактара часопіса „Шлях моладзі". За беларускую патрыятычную дзейнасць быў ён пакараны бальшавікамі і адсядзеў у сталінскіх лагерах. Пасля вызвалення вымушаны быў працаваць у польскіх школах. Памёр у 1990 годзе. На імпрэзе быў паказаны дакументальны фільм з паховін, на якіх з развітальнымі словамі выступілі Данута Бічэль-Загнетава з Гародні, Пятро Малафей з Салечнік і Аляксей Анішчык.

На імпрэзе прысутнічалі трое сяброў БХД з Беларусі. Каардынатар праекта „Пакаянне" Валерыя Чарнаморцава перадала прывітанне ад вельмі паважанага ў нас Паўла Севярынца і распавяла пра дзейнасць і мэты арганізацыі БХД.

Свае выступленні падзеям у Беларусі і Літве прысвяцілі Кастусь Манкус — пра трагічныя падзеі 24 і 27 лістапада 1996 г., Алег Аблажэй — пра свой шлях да беларускага пісьменства. З прывітальным словам выступіў дырэктар Фонду грамадзянскай абароны Стасіс Каўшыніс.

Заключным акордам на імпрэзе было святкаванне дня народзін сябра Рады ТБК, ганаровага войта (старасты) Вяркійскі сенюніі Вільні Вацлава Гульбіновіча. Самыя шчырыя віншаванні і пажаданні паважанаму юбіляру выказвалі ўсе прысутныя за святочным сталом. З добрым настроем і жаданнем далей працаваць для беларускай справы развіталіся сябры да наступнай сустрэчы ўжо ў новым 2012 годзе.

АГЛЯДАЛЬНІК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: Адрыяна Гуральчук (ПШ у Нарве).
2. Твой любімы прадмет: выхаванне і падрыхтоўка да жыцця ў сям'і.
3. У жыцці хачу стаць: юрысткай або лекарам.
4. У сяброў цаню: шчырасць, калі яны стрымваюць слова, дабрыню.
5. Не люблю: маны.
6. Па-беларуску размаўляю: з дзядулямі Генкам і Янкам, бабуляй Нінай, на ўроках беларускай мовы.
7. Кніжка, якая мяне захапіла: „Персі Джэксан і алімпійцы" Рыка Рыярдана.
8. Падабаецца мне музыка: разнавідная.
9. Твае ўлюбёныя стравы: курыная грудзінка з ананасам.
10. Твой любімы спосаб адпачынку: чытаць кніжкі.
11. Калі дарасту, хачу жыць: у Галандыі, бо там жыве мая мама.

Як Бочка ў госці хадзіла

(пішуць вучні)

Жыла-была Бочка. Сабралася яна аднойчы ў госці да суседкі. Прыбралася, надзела капялюшык і выкацілася на дарогу.

Дарога была нядоўгай. Не паспела раскаціцца — паказаўся суседчын дом. Адчыніла Бочка дзверы, зайшла, прывіталася, павесіла капялюшык на цвік і пераступіла парог кухні. Адтуль чуўся надта смачны пах. Яе суседка Каструля варыла кашу.

— Можа ты не абедала яшчэ, дык сядай, падмацуйся з дарогі, — запрасіла гасцінная гаспадыня Бочку да стала. Каша была такая смачная, што Каструля ніяк не магла накарміць Бочку. Яе суседка-таўсцюшка ела так многа, так старалася, што неўзабаве раздзьмулася і ... лопнула. Толькі абручы разляцеліся. А спалоханая Каструля ў смутку падумала: „Ці ў гасцях, ці дома не будзь скваным да яды, а то станеш падобным на Бочку".

Коля МАЛІНШЧЫК
СШ, Віцебск

Міра ЛУКША

Зорачкі

З „Зоркай" кожны вучань зорка, ці ён Віктар, ці Ягорка, Ніка, Юля ці Агатка — усе Зорчыны дзіцяткі.

Фота Ганны Кандрацюк

Гімназісты з Гарадка

Музыка з кайфам

Горану не гора

Менск — еўрапейская сталіца. Даказаў гэтага чарговы канцэрт сусветнай зоркі. У Палацы Рэспублікі выступіў славуты „вясельна-пахавальны аркестр" (Wedding and Funeral Orchestra) і яго дырыжор Горан Брэгавіч! Можа складана было б назваць яго *celebrity (славутасць)*, але ў свеце музыкі гэта не толькі аўтар выдатных кампазіцый, але таксама зорка, якая ярка свеціць ужо амаль сорак гадоў. Чаму варта пісаць пра такога дзедку як Брэгавіч? У пачатку 1970-х гадоў пачаў ён прыгоду з рок-музыкай і фактычна наступныя пятнаццаць стварыў легенду. Гурт называўся „Белы гузік", у арыгінале „Bijelo Dugme", і быў гэта самы вядомы гурт у гісторыі югаслаўскай сцэны. Сам Брэгавіч выводзіцца з сербска-харвацкай сям'і. Складаны лёс выпрабоўваў жыхароў балканскіх краін, таму музыка вырашыў, што неабавязкова гісторыя будзе вызначаць яму кірункі працы, што сутнасцю стане музыка, яе атмасфера, унікальны стыль, а заадно вельмі балканскі характар. Так як была Югаславія, так і творчасць Горана Брэгавіча апынулася „на скрыжаванні культур", а нават „на скрыжаванні светаў". Нават ягоны славуты аркестр, які размяжоўвае, а можа спалучае атмасферу вяселля і пахавання, стаіць у музычным плане на мяжы жыцця і смерці, працягвае творчыя пошукі ідэйнага бацькі. Відаць, што рок-музыкі было яму мала. Але ці стаў бы каралём залаў і стадыёнаў, каб не фільмы Эміра Кустурыцы? А можа дзякуючы музыцы Горана Брэгавіча фільмы запомніліся такой шырокай публіцы? Гэтая залежнасць незвычайная і напэўна спрацавала ў абодва бакі. „Час цыганоў", „Underground" ці „Сон Арызоны" — класіка еўрапейскага кіно і класіка фільмавай музыкі. Але творчасць Брэгавіча не абмяжоўваецца да кінаступжак. Як добры мэнеджар ён ведае, дзе і калі прыціснуць кнопку! На хвалі папулярнасці рыхтаваў супольныя праекты з рознымі лакальнымі зоркамі (у Польшчы з Каяй і Кшыштафам Краўчыкам), а гэта забяспечыла яму прыхільнасць чарговых слухачоў на многія гады. Можна сказаць, што Брэгавіч, як Моцарт, будзе вечны! А калі не ён сам, то напэўна яго кампазіцыя „Калашнікаў"!

i_basovka@o2.pl

Жаданы канцэрт

Пасля выступаў у Празе і Берліне Лявон Вольскі прыехаў у Беласток. Апошнім разам іграў на Падляшшы на „Бардаўскай восені” ў мінулым годзе. Гледзячы на поўную залу клуба „Альхімія” можна сказаць, што канцэрт раз у год, гэта недастаткова для падляшскіх меламанаў. У сераду, 23 лістапада, Лявон Вольскі зайграў акустычны канцэрт.

Ужо на некалькі гадзін да выступу ў клубе пачалі збірацца людзі. Прыходзілі зусім маладыя асобы, якія сама пазнаюць творчасць Вольскага, і такія, якія памятаюць яго яшчэ з гурту „Мроя”.

— Як першае каханне з'яўляецца самым важным, так для мяне Вольскі найбольш падабаецца з гуртом „Мроя”, — сказаў Міхал Стэльмашук, і дадаў: — Можа па той прычыне, што ў той час я быў яшчэ малады.

Да пачатку канцэрта ўсе месцы былі занятыя. Зала была ўжо цалкам запоўнена, калі да гледачоў далучылася яшчэ моладзь з белліцэя з Бельска-Падляшскага.

— Мы спецыяльна прыехалі на канцэрт, гэта было рашэнне вучняў, — сказаў настаўнік Уладзімір Вавульскі. — Гэта галоўным чынам іх ідэя.

Можа не да канца ўсе ліцэісты мелі шчырае жаданне ўдзельнічаць у канцэрце. Выпадкова пачула размову двух дзяўчат: „Мне так не хацелася прыязджаць”, на што другая адказала: „Ну, але дзякуючы гэтаму заўтра не будуць адпытваць нас па біялогіі”. Не толькі вышэйзгаданыя дзяўчаты, але напэўна кожны меў асабістыя прычыны, для якіх прыняў удзел у канцэрце.

— Для мяне Лявон Вольскі з'яўляецца бардам свабоды, — дадаў Уладзімір Вавульскі. — Памятаю добра яго выступы на „Басовішчах”. Ну, цяжка казаць аб сваіх пачуццях, але гэта для мяне легенда.

Не толькі Вольскі з'яўляецца так чаканым беларускім вакалістам на Падляшшы, але і Падляшша для Вольскага неабыякавае.

— Я даўно не іграў у Беластоку. Тут пачыналася мая замежная кар'ера. Беласток гэта быў першы замежны горад, які я пабачыў на свае вочы, таму ён выклікае сентымент, — сказаў Лявон Вольскі. — Тут свае людзі, тут як дома. Колькі разоў я быў... З гэтага ўсё пачыналася. Я адчуваю, што Падляшша гэта Беларусь па вялікім рахунку.

Лявон Вольскі прыехаў з вядомымі песнямі з яго ранейшай творчасці, але ўжо абвясціў аб сваім новым праекце.

— Ну, гэта сакрэтна, але скажу, што зараз з „Крамбамбуляй” робім новы альбом і там беларускую народную песню, у дакладнасці палескую песню „Ой сівы конь бяжыць”, спяваю я і дзяўчына з Бразіліі. Таму што нам істотна прыцягваць людзей іншых культур. Беларусь вельмі замкнёная ў сэнсе культуры, таму нам варта рабіць пастаянна дуэты, працягнуць супрацоўніцтва з замежнымі музыкантамі.

На песнях гуртоў, якія заснаваў Вольскі, расце ўжо наступнае пакаленне. У іх рэпертуары менш знаёмыя песні, і тыя, словы якіх усе ведаюць. Сам Лявон Вольскі вырашыў:

— Пакуль мне ёсць што сказаць і людзі мяне слухаюць — гэта клас. Калі гэта скончыцца і не буду ўжо хацець пісаць песні, тады перастану гэта рабіць. У нас, у Беларусі, яшчэ такая цяжкая сітуацыя ва ўсе гэтыя гады. Успамінаючы першыя „Басовішчы” думаю, што цяпер яшчэ горш, чым было тады. Таму нам ёсць пра што спяваць, безумоўна, і для мяне ў прыватнасці.

Для мяне творчасць Лявона Вольскага ў гурце „NRM” асабліва блізкая. Я пачула аб ім даволі позна — будучы ў сярэдняй школе. Дзякуючы гэтаму магла я параўнаць мову, якой карыстаюцца людзі на Сакольшчыне, да мовы, якой не называюць простай ці сваёй толькі беларускай. Пачула я песні на мове, якой карыстаюцца і адначасова саромяцца людзі ў маёй вёсцы. Таму не ведаю, ці магу аб'ектыўна ацаніць выступ Лявона Вольскага, але скажу, што для мяне ён вельмі падабаўся. Яго творчасць выхоўвае, абуджае ў людзях свядомасць, вучыць не ставіцца абыякава да свету, не замыкацца толькі ў прасторы сваёй ся'мі, але глядзець шырэй.

Уршуля ШУБЗДА

І зайздрасць, і захапленне, і ...

16 лістапада 2011 г. у Гімназіі ў Нараўцы быў незвычайны госць – „Зорка” ў асобе рэдактар Ганны Кандрацюк.

Мы былі вельмі цікавыя як выглядае штодзённае жыццё і праца журналіста і ў сувязі з тым падрыхтавалі пытанні, якія абавязкова хацелі задаць госці. Сёння мы памяняліся месцамі і ў ролю журналістаў увайшлі Кася Трусевіч і Павел Засім з III „б” класа.

Першае, што нас уразіла, гэта адказы пані Ганны. Яны былі доўгія і вычарпальныя. Вучняў гэта заўсёды здзіўляе як можна так доўга аб чымсьці гаварыць (нам на ўроку так не атрымліваецца).

Рэдактар расказала нам аб першых гадах сваёй вучобы, зацікаўленнях польскай мовай і падарожжамі. Усіх вельмі ўцешыла, што быўшы ў нашым узросце, яна не заўсёды была паслухмянай дзяўчынкай (камень з сэрца).

Журналістка многа гаварыла аб сваіх падарожжах і сустрэчах з людзьмі. Мы даведаліся, што гэта прафесія з пэўнай місіяй – паказаць чытачам цікавае, дзіўнае, важнае, часта дапамагчы чалавеку.

Выслухаўшы расказ, нам здавалася, што яна з'ездзіла ўвесь свет і гэтага мы ёй моцна зайздросцілі. Аднак зразумелі таксама, што праца журналіста цесна звязваецца з вялікімі эмоцыямі і самаахвярнасцю, асабліва калі ідзе пра сям'ю і вольны час.

Усе дайшлі да вываду, што гэта праца нялёгкая, але калі хтосьці не любіць сядзець на месцы і патрапіць добра апісаць пачутае і ўбачанае, гэта праца для яго.

Сустрэча з пані Ганнай была вельмі сімпатычная. Мы ацанілі нашую госцю як вельмі адважную асобу, якая любіць людзей і канчае заўсёды тое, што пачала.

Гэтае спатканне прымусіла нас таксама да рэфлексіі, што добра, калі ў жыцці чалавек робіць тое, што любіць, а тады напэўна робіць тое з пасіяй.

*Удзельніцы сустрэчы – **Ангэліка Скепка, Марта Пташынская, Марта Лукша***

Каляднны конкурс

Прывітанне, сябры! У нас працяг тэматычнага конкурсу, звязанага з перыядам зімы. Разам з адказамі, калі ласка, пазначце нумар конкурсу.

1. Як на Падляшшы называюць сцябло каласоў, якія ў час Каляд ставяць у акне:

а) кветка,
б) перапёлка,
в) госцік.

2. Які на Падляшшы традыцыйны матыў каляднага дэкору ўнутры хаты:

а) амяла,
б) павук з саломы,
в) падсветлены Санта Клаўс.

3. Як завецца беларускі літаратурны семінар, якія звычайна праходзіць у снежні:

а) Паэтычныя прымаразкі,
б) Снежань з літаратурай,
в) Бязмежжа.

4. Назавіце прозвішча беларускага мастака, які нядаўна ў Гайнаўскім беларускім музеі паказаў цыкл карцін пад загалоўкам „Вера”.

а) Міраслаў Здрайкоўскі,
б) Юрка Федарук,
в) Славамір Смык.

Адказы дасылайце да 18 снежня 2011 г. (найлепш па электроннай пошце на адрас „Зоркі”). Тут разыграем цікавыя ўзнагароды: беларускія кніжкі, CD і гульні.

Рашэнне конкурсу № 8: Помнік Станіславу і Юзафу Булак-Балаховічам пастаўлены ў Белавежскай пушчы (па дарозе з Гайнаўкі ў Белавежу (а). Аўтарам помніка з'яўляецца мастак Віктар Кабац (а). Новы альбом рыхтуе наша „Ріма” (б). Дакалядны посны перыяд у народзе называюць „Піліпаўка” (в).

Узнагароду, кніжку а. Канстанціна Бандарука „Пазнай сваё” (пра рэлігійныя абрады і звычаі) выйграла **Малгажата Іванюк** з Парыева. Віншуем! .

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Мы ўжо багатыя

Хвалілася сяброўка Кяця:
— Маем усё ўжо ў нашай хаце,
Нічога болей нам не трэба,
Усе запэўнены патрэбы.

Калі з камандзіроўкі тата
Прывёз гітару мне і брату,
Мама з прыемнасцю сказала:
— Таго нам толькі не хапала!

Чаму ў белым і чорным?

У царкве пад алтаром
Маці стаіць з малым сынком.
Будзе вянчацца зараз
Тут маладая пара.

Маму сынок пытае:
— Чаму ў белым маладая?
— Шчаслівай хоча быць заўжды.
— Дык чаму ў чорным малады?

Польска-беларуская крыжаванка № 50

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 46:

Яр, клас, страва, рост, рэспубліка, ом, пагранічнік, новы, но, кекс, сандал.

Рэха, нос, гак, спор, імгла, Ас, нос, стол, іва, чын, паркан, асіна, дах, кол.

Узнагароды, аўтаручкі і беларускі каляндарык на 2012 год, выйгралі **Магда Міхалевіч, Дыяна Галёнка, Магдаліна Ваўранюк, Віялета Дработка, Эльвіра Андрусевіч, Мартына Швед** з Бельска-Падляшскага, **Каміль Садоўскі** з Нараўкі, **Вікторыя Лукашук** з Нарвы, **Дыяна Галёнка** з Дубіч-Царкоўных. Віншуем!



Непрафесіяналы паказалі высокі ўзровень

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Звычайна ў час конкурсаў і аглядаў гаворыцца, што з кожным чарговым выпускам узрастае мастацкі ўзровень прэзентаваных песень, дэкламацыі, тэатральных пастановак ці твораў мастацтва. Няйначай было і ў час падвядзення вынікаў XVIII Агляду непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі і адкрыцця конкурснай экспазіцыі лепшых прац, якое адбылося 27 лістапада ў гарадской галерэі „Гайна" ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. Аднак пра ўзровень сёлетняга конкурснага агляду, які ад пачатку ладзіць Гайнаўскі дом культуры, гаварылі не толькі прадстаўнікі конкурснай камісіі, арганізатары ці ўдзельнікі агляду, але і яго пастаянныя назіральнікі. Наведвальнікі конкурснай выстаўкі хацелі б таксама, каб мастакі часам адыходзілі ад традыцыйнага жанру і час ад часу паказалі нешта новае, незвычайнае. Можа і было б так, калі б мерапрыемства не мела конкурснага характару, у якога ёсць свае правы. Мастакі, у якіх сур'ёзны падыход да змагання за перамогу, прывозяць для ацэнкі свае лепшыя работы, а працы з зусім новымі формамі найчасцей паказваюць на няконкурсных выстаўках.

Славамір Рыбак каля сваіх карцін

Адметнасцю сёлетняга конкурсу былі пастэлі Яцка Некраша, які першы раз прыняў удзел у аглядзе і перамог у катэгорыі рысунка, апярэджваючы нават шматкратнага пераможцу ў гэтай катэгорыі, сёлетняга лаўрэата другога месца Юрыя Жукоўскага (узнагароджаны за лясныя краявіды). Пастэлі Некраша выклікалі самыя розныя ацэнкі, ад захаплення яго варштатам работы і формулай прэзентавання ідэй, да крытыкі за змест абстрактных работ. Пераважна традыцыйна было ў іншых катэгорыях, хаця паяўляліся новыя цікавыя прапановы ад асоб з абмежаваннямі (змагаліся яны ў асобнай катэгорыі). Напрыклад, Міраслаў Данілюк, удзельнік заняткаў па працатэрапіі, якія вядзе ў Гайнаўцы Свята-Троіцкі праваслаўны прыход, выканаў аплікацыю з выявай Свята-Троіцкага сабора на першым плане (абклеіў работу разнародным насеннем).

Адна з галоўных мэт конкурснага агляду — прэзентацыя работ новых творцаў з Гайнаўшчыны.

— Я займаюся жывапісам ад нядаўна і малюю толькі ў вольны час. Калі мае работы, ці працы іншых аматараў, апынуліся на конкурснай выстаўцы гэта ўжо нейкая перамога. Ад камісіі можна даведацца аб сваіх хібах і старацца пазбегнуць іх у будучыні. Гледзячы на разнародныя работы, можна таксама навучыцца нечаму новаму, — сказаў навічок Міраслаў Хіліманюк, якога дзве карціны красуюцца ўжо на выстаўцы.

— З кожным годам на конкурсе паяўляецца штораз больш работ і яны штораз больш цікавыя і арыгінальныя, — заявіў бурмістр Гайнаўкі Ежы Сірак.

Звярнуў ён увагу на асобы з абмежаваннямі, якія на свой спосаб дабіліся поспехаў, адны перамагаючы, а другія прэзентуючы свае работы на конкурснай выстаўцы. Першае месца ў катэгорыі інвалідных асоб заняў Марк Зін з Павятовага асяродка дапамогі ў Гайнаўцы (мяшаная тэхніка), другое месца — Марк Сакоўскі (за рысункі пастэльным алоўкам), а трэцяе Яўген Вісьнеўскі (інтарсія), абодва таксама са згаданага асяродка. Вылучэнне атрымала Марыя Бяленя з Дома сацыяльнай дапамогі „Ракітнік" з Белавежы.

— Я міла ўзрадаваны заўважыўшы, што непрафесійныя творцы зрабілі заўважальны прагрэс. Галоўнае ў нашым конкурсе, каб яго ўдзельнікі маглі паглядзець на работы іншых творцаў і нечаму новаму навучыцца. Працы, якія мы адабралі на конкурсную выстаўку, гэта работы з вялікай мастацкай і эмацыянальнай вартасцю. У працах мы заўважылі свежасць і багацце колераў. Напрыклад, вельмі спадабаліся мне пастэлі Яцка Некраша, які першы раз прыняў удзел у конкурсе і адразу заняў першае месца ў сваёй катэгорыі. Варта шукаць новыя канцэпцыі, каб знайсці свой стыль, — сказаў старшыня конкурснай камісіі, гайнаўскі мастак Збігнеў Будзыньскі. — Рабіце сваё і перарабляйце на вашых работах акружаючы вас свет паводле вашага бачання. Прыйшоў час адкрыцця нам на Еўропу, бо ў Гайнаўцы і наваколлі ствараюць добрыя мастакі.

Інструктар мастацтва Гайнаўскага дома культуры Зінаіда Якуць, адказная за арганізацыю конкурснага агляду паінфармавала, што 35 аўтараў заявіла 133 работы, з якіх 90 прац прэзентуецца на выстаўцы. Дырэктар ГДК Расціслаў Кунцэвіч спаслаўся на гісторыю конкурсу, які сёлета адбыўся ўжо васемнаццаты раз пры фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы ў Беластоку і Гарадской управы ў Гайнаўцы. Адна са статуэтак, якія выканаў гайнаўскі мастак Юрый Івацік, прыпала галоўнаму сёлетняму пераможцу, а такім неафіцыйна лічыцца ў Гайнаўцы лаўрэат першага месца ў катэгорыі жывапісу, якім ізноў стаў Славамір Рыбак.

Мікола Яноўскі за шматгадовы паспяховы ўдзел у конкурсным аглядзе атрымаў вялікую, па габарытах, узнагароду (злева дырэктар ГДК Расціслаў Кунцэвіч)

— Мае ўзнагароджаныя карціны з гусямі і хлеўчыкам выканаў я ў Рэспубліцы Беларусь. На адной намаляваў краявід з вёскі Расна, а на другой — краявід з-пад Белавежскай пушчы, але з другога боку мяжы. У бліжэйшым часе я ізноў паеду ў Беларусь, дзе ў тамашнім музеі будуць паказвацца мае карціны з цыкла „Белавежская пушча", — заявіў жывапісец Славамір Рыбак. — На сваіх працах я стараюся паказаць той настрой, які зарэгістравала мая памяць, калі я захапіўся нейкім месцам. Асаблівую ўвагу звяртаю таксама на вельмі важныя ў жывапісе колеры. На чатырох работах, якія прывёз я на конкурс, хацеў паказаць камісіі мой розны варштат працы і таму адна з маіх карцін такая светлая ў параўнанні з іншымі. Нават члены камісіі жартавалі, што з-за гэтай работы чакае мяне сем светлых гадоў у маёй творчай працы. А так па-сур'ёзнаму, то старшыня камісіі Збігнеў Будзыньскі пахваліў мяне, што я за апошнія гады зрабіў вялікі прагрэс у мастацкім развіцці.

Наведвальнікі выставы з асаблівым зацікаўленнем глядзелі менавіта на карціны Славаміра Рыбака, які больш за пяць разоў быў ужо лаўрэатам першага месца на гайнаўскім аглядзе і займаў іншыя прызавыя месцы.

— Карціны Славаміра Рыбака напамінаюць мне рэалістычны жывапіс Івана Шышкіна. Мне здаецца, што гэта падобны варштат працы, — заявіў гайнаўскі фатограф Уладзіслаў Завадскі.

Канкурэнт Славаміра Рыбака па рэалістычным жывапісе Мікола Яноўскі са Старога Беразова ў гэтым годзе атрымаў трэцяе месца (у мінулым годзе другое).

— Я атрымаў узнагароду за алейныя карціны „Іней..." і „Лета", бо сказалі мне, што не было да якіх карцін прыраўняць маю „Тайную вячэру", — сказаў Мікола Яноўскі.

Другое месца ў галіне жывапісу за „Успаміны з Крыма" заняла Тамара Кердалевіч з Чаромхі, а вылучэнні атрымалі Дыяна Янчук, Уршуля Гіншт і Міхал Крушэўскі. У катэгорыі рысунка трэцяе месца заняў Януш Кулеша (краявід каля вады), а вылучэнне атрымала Малгажата Мруз. Сярод разьбяроў перамог Яраслаў Міхальчук за барэльеф у драўніне „Апошняя вячэра". Другое месца заняў Міхал Коц за трыпціх „Бяседнікі" (разьба па дрэве), трэцяе — Мікола Ягадніцкі за трыпціх „Грунвальд" (барэльеф у драўніне). Камісія вылучыла Мечыслава Дудзіна.

У катэгорыі творцаў з мастацкай адукацыяй узнагароду атрымаў Аркадзій Свентахоўскі за працы „Святая Тройца" і „Збавіцель" (тэмпера).

— У нашым арышце арганізуем разнародныя заняткі з мэтай рэсацыялізаваць нашых падапечных і прыстасоўваць іх да нармальнага жыцця пасля заканчэння пакарання. Двух зняволеных, што займаюцца жывапісам, прыняло ўдзел у конкурсе і адзін атрымаў вылучэнне. Весці заняткі прыязджаюць да нас таксама выкладчыкі з Рэспублікі Беларусь. Вучаць яны займацца з глінай і саломапляценнем, — сказаў дырэктар Следчага арышту ў Гайнаўцы Раман Пашко.

Былі ўручаны дзве ўзнагароды за шматгадовы паспяховы ўдзел у аглядзе: Міколу Яноўскаму са Старога Беразова і Дыяне Янчук з Навасадаў.

— Я ўжо восем гадоў удзельнічаю ў аглядзе непрафесійнага мастацтва і займаў усе прызавыя месцы. Ад конкурснай камісіі і падглядваючы іншых можна тут многаму навучыцца, — сказаў Мікола Яноўскі.

— У гайнаўскага мерапрыемства мілая атмасфера і ёсць магчымасць паказаць свае работы шырэйшай публіцы. Мне, напрыклад, некаторыя работы не цікавяць, але заўсёды можна знайсці такія працы, якія зацікавяць людзей, — сказала Дыяна Янчук.

Наведвальнікі конкурснай выстаўкі цікавіліся лепшымі працамі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Пісаць можа кожны ў Гарадку

Пераможцы конкурсу з Тамарай Болдак-Яноўскай

Ужо пяты раз прайшоў літаратурны конкурс „Пісаць можа кожны". У цэнтры культуры ў Гарадку, што на Беласточчыне, журы адзначыла найлепшых мясцовых аўтараў. На ўрачыстым падвядзенні вынікаў конкурсу 25 лістапада прызнаны былі ўзнагароды за беларускамоўныя і польскамоўныя творы, у большасці за лірыку. Імпрэза традыцыйна пачынаецца вядомай песенькай Ежы Штура, спрытна перароблена Янкам Грыцуком, пра дамарослага складальніка вершаў, свядомага свайго несумненнага таленту. Вядома, гэта жарт, бо ніхто з аматараў пяра ў Гарадку і ваколіцы не захварэў напыхлівай зорнай хваробай, а пішуць яны ад сэрца і да сэрца.

Габрыся Нічыпарук пісала... аж паламала?

Янка Федзюкевіч і Анатоль Парэмбскі

На думку дырэктара Гарадоцкага цэнтра культуры (Дома культуры імя Кастуся Каліноўскага) Юры Хмялеўскага, ініцыятыва конкурсу належыць самім аўтарам, сябрам літаратурнага згуртавання „Каласы", а найперш Кастусю Казлоўскаму:

— Гарадоцкая зямля асаблівая тым, што тут жывуць незвычайныя людзі, таленты. Гэта мае свае карані яшчэ ў мінулым, таму што з Гарадоцкай зямлі выводзяцца знакамітыя паэты-нашаніўцы Сцяпан Пятэльскі — М. Арол з Гарадка і Янук Дарашкевіч — „Каршун" з Меляшкоў. І цяпер жыхары Гарадоцкай зямлі пішуць вершы, апавяданні. Гэта перш за ўсё самадзейнікі, але пішуць яны ад сэрца.

Ганаровым госцем урачыстасці была Тамара Болдак-Яноўская, родам з Гарадоцкай гміны — з Нарэйкаў, вядомая пісьменніца, жыхарка Ольштына. Летась яе кніга была вылучана на прэстыжную польскую ўзнагароду „Ніке" за найлепшую кнігу года. Арганізуе яна штогод у сваёй вёсцы сямейна-літаратурныя з'езды, якія маюць ужо міжнародны абсяг. У час сустрэчы аўтарка распавяла пра сваю творчасць і дзіцячыя гады на Гарадоцкай зямлі, кніжна-самотныя, паколькі яе сям'я жыла наводшыбе ў хатцы чыгуначнага абходчыка.

Анатоль Парэмбскі з Валілаў-Станцыі стаў пераможцам у катэгорыі беларускіх аўтараў. З ягонай падборкі асабліва вылучаўся верш „Супраслянскі прастор". У сваім жыццяпісе каларытны старажыл з Валіл-Станцыі распавядае:

— Явіўся я на свет на каталіцкае каляднае свята ў 1927 годзе ў Страшаве. У бацькі была вялікая радзіна і хоць жылі браты бацькі нібы паасобна, але ў адной хаце. Жыло ў той час у нашай хаце шаснаццаць асоб, у тым ліку сямёра дзяцей. Калі я меў два гады, бацька купіў зямлю ў калёніі Мастаўляны і перанёсся туды жыць. Там хадзіў я ў пачатковую школу і там пачаў пісаць вершы са сваім сябрам Янкам Бегебам, да чаго нас нагаварыў Янкаў бацька. Першыя вершы мы выслалі ў „Піянера Беларусі" ў Мінску, дзе атрымалі яны пазітыўную ацэнку. Вайна перарвала наша пісанне. Пасля вайны я трохі пісаў у г.зв. „шуфляду". Будучы дарослым, здабыў я сярэднюю адукацыю ў сельскагаспадарчым тэхнікуме ў Беластоку. З 1974 г. жыву ў Валілах-Станцыі. Працаваў у сельскагаспадарчых установах. Калі пайшоў на пенсію, маючы многа вольнага часу, стаў пісаць болей. Выдаў два томікі вершаў. Пішу далей і на думцы маю, каб яшчэ выдаць хоць два зборнікі.

Анатоль Парэмбскі вельмі шкадуе, што прыціхла супольная праца літаб'яднання „Каласы", сябры якога не толькі пісалі, але і выступалі са сваімі творамі на сцэне ў адмысловых спектаклях, з цікавым сцэнічным афармленнем і музыкай. Хоць паасобныя аўтары надалей не пакідаюць пяра і гітары, калі хто мае яшчэ і музычны талент. Бывае, што па прычыне ўзросту ці хваробы іх актыўнасць таксама крыху абмежаваная, калі гаворка прынамсі пра супольныя выступы, як, напрыклад, у выпадку спадарыні Ніны Цыванюк.

У катэгорыі дарослых на разгляд журы свае творы прыслала 11 асоб — апрача Анатоля Парэмбскага з Валіл-Станцыі, Станіслава Дамброўскага з Сафіпаля і новага жыхара Меляшкоў Густава Мішталя ды Таццяны Пшэкоп з Беластока, апошнія былі са сталіцы Гарадоцкай гміны — Ян Федзюкевіч, Мікалай Гегель, Янка Грыцук, Раіса Шымборская, Міхал Шышкевіч, Адам Застоцкі і Марыя Врублеўская — вядомая спявачка, аніматарка культуры і гмінная радная. Першае месца за польскамоўныя вершы „З крэсавых плётак" атрымаў Станіслаў Дамброўскі. Сярод школьнікаў (14 асоб) найбольш паэтаў было сярод вучняў ПШ у Гарадку. Наймалодшая ўдзельніца — вучаніца IV класа Аляксандра Яроцкая, якая двойчы ўжо выйграла конкурс „Пазнай Беларусь" сваімі малюнкамі, як адзіная з Гарадоцкай гміны прыслала таксама свае вершы на конкурс „Дэбют" у „Ніве". Свае вершы запрапанавалі яшчэ вучні ПШ Мартына Мытых, Каміля Сэвёла, Ян Адамчык, Аляксандра Азябла, Пятрусь Кананчук, Патрык Лукаш Шыманюк, Кацярына Грыка, Віялета Хлябіч, Каміль Неміровіч і Гарбыеля Нічыпарук (пераможца) ды гімназісты Пётр Тарасэвіч і Патрыцыя Карлаў, а таксама ліцэістка Караліна Яроцкая. Як звярнула ўвагу старшыня журы Тамара Болдак-Яноўская, і маладыя аўтары, і старэйшыя, у большасці „паэтызавалі" крыху ў старасвецкім, дзевятнаццацівечным стылі, свае эмацыянальныя развагі стараліся змясціць у форму большменш традыцыйнага верша, стараючыся часам натужліва рыфмаваць. Перамаглі аўтары, у творах якіх адчуваўся дух сучаснасці, бачыліся спробы абагульнення спраў, якія кранаюць цяперашняга чалавека, жыхара памежнай мясцовасці ў XXI стагоддзі, а таксама прыкмячалася фармальная свядомасць вершапісання.

— Ці Гарадок гэта мястэчка?.. Амаль у кожным вершы ён выступае вёскай, — заўважыла Тамара Болдак-Яноўская. — Звярталі мы ўвагу таксама на тое, ці творы напісаны сучаснай мовай, а калі верш рыфмаваны, не мёў „лёгкай", „паношанай" або выпадковай рыфмы. Спадабаўся мне верш Олі Яроцкай, без прэтэнзій, пад загалоўкам „Мой Гарадок", дзе не было таго „паэтызавання", але і тут былі тыя лёгкія, накідваючыеся рыфмы. Вельмі цікавыя, адухоўленыя вершы напісаў Станіслаў Дамброўскі, дзе немагчыма было выбраць найлепшы — усе былі добрыя: ёсць тут добрая мова, вялікая, пластычная ўява, сучаснасць погляду; яны потсмадэрністычныя, а заадно звязаныя з традыцыяй, крышку „пост-лесьмянаўскі" тут свет... Відаць тую прысутнасць духоўнага свету ў век, у якім у паэзіі таго ўжо няма... У яго вершы ёсць уласная логіка, таямніца... Што цікава, здалося, што паэт будзе намнога старэйшы, нават зусім стары...

— Хочацца, каб пасля нас штось засталося, — прызнаўся Анатоль Парэмбскі, аколены на сцэне маладняком.

Неўзабаве паявіцца зборнік твораў гарадоцкіх пісьменнікаў, улічваючы недрукаваныя творы памерлай ужо Надзеі Дудзік, даваеннай гарадоцкай дзяячкі Таварства беларускай школы, а таксама першае выданне адзінага зборніка лірыкі Янука Дарашкевіча, які ў віленскім архіве чакаў свайго выдання больш за сто гадоў.

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Супраслянскі прастор

Спакойныя рады
Са славянскай душой
Пралажылі на Супрасль дарогі
І разбілі над рэчкай пастой
І разбілі над рэчкай пастой
У заколя ракі
Незвычайны забор
Каб абсяг шырыць ва ўсе бакі
І бараніць жыццёвы прастор
І бараніць жыццёвы прастор
Зялёныя гоні
Пясчаны загон
Дзе прашчураў нашых далоні
Складалі нашчадкам свой плён
Складалі нашчадкам свой плён
З бегам часу калі
Замак стаў на падзіў
Гарадоцкія тут землякі
Абнялі натуральны масіў
Абнялі натуральны масіў
Выносныя сосны
Жывічны запах
На лонях крыштальныя росы
Неаб'ёмны для вока абсяг
Неаб'ёмны для вока абсяг
Супраслянскі прастор
Сніцца мне раз-пораз
Непрыхільнасці наперакор
Не разлучыць ніякі траф нас
Не разлучыць ніякі траф нас

Надзея ДУДЗІК

* * *

Чуеш, нехта парою
Плешча мовай чужою,
Пагарджае табой з слепаты —
Што ж — нямога душою,
Не сябруе з красою.
Відна кветку
і палын з-за вярсты.

Я маленькай бывала,
Янкі вершы чытала,
Палюбіла цябе як магла.

Бо ты — родная мова,
У цябе кожнае слова
Я з грудзей сваёй маткі ўзяла.

Гарадок, 21.VII.1975

ЗАПРАШЭННЕ

запрашае на беластоцкую прэм'еру спектакля

„Я й у полі вэрбою росла"

якая адбудзецца 9, 10 і 11 снежня 2011 г. у Тэатральнай акадэміі ў Беластоку, вул. Сянкевіча, 14.

Пачатак спектакляў:
9 снежня 2011 г. — гадз. 20:00
10 і 11 снежня 2011 г. — гадз. 18:00

Білеты можна набыць на паўгадзіны да спектакля.

Тэкст і фота Лукаша ЛЕАНЮКА

„Камедыя” на Падляшшы

Гродзенскі абласны драматычны тэатр прыехаў з гастролямі на Падляшша. З п’есай „Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання” гродзенскі тэатр выступае ўжо дваццаты год.

На Падляшшы акцёры з Беларусі паказалі гэты спектакль ужо другі раз. Сёлета аглядалі яго, між іншым, жыхары вёскі Дубіны. Акцёры ў час наведання Падляшша выступілі таксама ў Гайнаўскім белліцэі і ў Бельскім доме культуры. На канец п’есу паказалі беластоцкай публіцы. Прыезд тэатра магчымы быў дзякуючы намаганням Мікалая Бушкі і фонду „Царкоўная музыка”, а таксама дапамозе з боку Радыё Рацыя.

— Гэта п’еса беларускага аўтара Уладзіміра Рудава, — адзначыў намеснік дырэктара гродзенскага тэатра Аляксандр Габец. — У спектакля вельмі цікавая гісторыя, таму што калісьці мы ўжо яго перасталі іграць. Потым прайшоў нейкі час і пабачылі, што спектакль патрэбны ў рэпертуары. Людзі хацелі глядзець яго таму, што ён беларускамоўны і паказвае цяжкае жыццё беларускага народа ды суадносіны між блізкімі сабе людзьмі.

Селянін Дзёмка часта сварыўся са сваёй жонкай Маланкай і жыдам Давідам, якому вінен быў грошы за гарэлку. Ва ўлётцы, якую ўручыў мне

Аляксандр Габец, можна было прачытаць: „Пакрыўдзіўся Селянін на самога Адама, прабацьку чалавецтва, за тое, што Адам награшыў, а за грэх яго павінны мучацца простыя людзі. І вось у адзін з такіх пакутных дзён з’явіўся да Селяніна сам Чорт”. Прыйшоў з прапановай, каб пайсці ў заклад.

— Ты кажаш, што я не вытрымаю, каб гадзінку маўчаць? Я не вытрымаю, каб табе ў морду не даць! А гадзінку маўчаць вытрымаю! — кажа са сцэны разлаваны сялянін Дзёмка чорту.

— Нячысцік, якога я граю, зусім незвычайны, — адзначыў Ігар Уланаў. — На самой справе ён кожным разам даруе Дзёмку, калі гэты не вытрымае гадзіны без слова. Чорт дае селяніну шанц, каб той стаў лепшым чалавекам. Дзёмка гэтага шанцу не выкарыстоўвае.

— Нешчаслівы Дзёмка таму, што ён заблудзіўся ў сваім паняцці аб жыцці, — сказаў акцёр Аляксандр Луцэнка, які іграе сяляніна. — Ёсць у яго жонка і сябры, але ён цэлы час наракае на жыццё і блізкіх. Кожным разам, калі ён прайгравае заклад, адпраўляе д’яблу замест сваёй душы, жонку, потым жыда Давіда.

— Ён сам не хоча там ісці, — працягвае Давід, ролю якога выконвае акцёр Сяргей Курыленка. — Але Дзёмка потым разумее, што без жонкі, з якой заўсёды сварыцца і без жыда Давіда, які можа надта балбатлівы, жыць не можа.

Двухгадзінны спектакль выконвала чацвёра акцёраў. Цэнтральнае месца сцэнічнага афармлення складаў Дзёмкаў і Маланчын ложак. На сцэне не было многа рэквізітаў — толькі ложак, табурэтка і драўляны плот. Дзякуючы таму спектакль можна было зайграць у розных залах, непрыстасаваных паказваць тэатральня п’есы, напрыклад, у ліцэі ці ў Дубінах.

— Мы не часта маем магчымасць іграць у падобных месцах, — сказаў Аляксандр Габец. — Асабліва пажылыя жыхары Дубін вельмі сардэчна прынялі спектакль. Думаю, што змест спектакля быў ім блізкі па духу і сэнсе. Калі будзе магчымасць з нашага боку і патрэба з боку гледачоў, ахвотна прыедзем на Падляшша з беларускай „Камедыяй” чарговы раз.



Палітычная навука Беларусі знаходзіцца ў даволі цікавым стане. Цяперашняя ўлада не асабліва цэніць тыя здабыткі сусветных палітолагаў, думкамі якіх кіруюцца ў сваіх даследаваннях іх калегі. Вывучэнне палітычных працэсаў у краіне скіравана выключна на тое, каб не даць ім стаць нечым самастойным, не дапусціць іх уплыву на ўладу. Разам з тым, беларускія палітычныя працэсы і зрухі вывучаюць незалежныя даследчыцкія інстытуты, якія разумеюць, што першаснай з’яўляецца не ўлада, а тыя палітычныя сілы, на якія яна абапіраецца.

Адной з такіх незалежных даследчыцкіх арганізацый з’яўляецца Інстытут палітычных даследаванняў „Палітычная сфера”, які існуе пры Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Вільні. Сайт інстытута месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://palityka.org.**

Віртуальнае прадстаўніцтва навукова-даследчыцкай установы выглядае даволі прывабна. У нечым яно нагадвае вялікую стракатую афішу-расклад, дзе падаюцца не толькі назвы і тэрміны мерапрыемстваў, але і даюцца анатацыі да іх. Пры гэтым кожная „анатацыя”-анонс тэкста прыцягвае да сябе зрок інтэрнэт-карыстальніка цікавым загалоўкам — „Пачаць пісаць па-беларуску. Рэгіянальны і сацыяльны склад беларускага адраджэння, 1880-1918”, „Ідэя сучаснай Літвы” альбо „Крызіс веды пра Беларусь”.

Каб больш дэталёва пазнаёміцца з мэтамі і задачамі інстытута варта клікнуць на яго аднайменную рубрыку і выйсці на старонку „Канцэпцыя Інстытута”. „У Беларусі склалася асаблівая акадэмічная сітуацыя, якая ў галіне палітычных навук (даследавання палітыкі) праяўляецца ў двух асноўных сістэмных праблемах: адсутнасць (эмпірычных) даследаванняў і ізаляцыя ад рэгіянальнай і міжнароднай навуковай супольнасці”, — так, між іншым, абазначаюць прычыны неабходнасці сваёй дзейнасці стваральнікі і супрацоўнікі навуковай установы. На той жа старонцы распавядаецца пра гісторыю стварэння інстытута. Яна пачынаецца ад часопіса „Палітычная сфера”, які быў заснаваны ў 2001 годзе студэнтамі і аспірантамі кафедры паліталогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 2006 года акадэмічнай асновай супольнасці з’яўляецца Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт.

Адной з асноўных мэт дзейнасці навуковай установы з’яўляецца інтэграцыя беларускіх даследчыкаў у рэгіянальны, еўрапейскі і міжнародны акадэмічны кантэкст, стварэнне ўмоў для сумеснай даследчай дзейнасці, а таксама рэпрэзентацыя вынікаў даследчыцкай працы ў выглядзе публікацый.

Што ж тычыцца накірункаў навуковай дзейнасці інстытута, то яна падзяляецца на вывучэнне беларускай і ўсходнееўрапейскай палітыкі, еўрапейскія даследаванні, вывучэнне інфармацыйнай палітыкі і даследаванняў інтэрнэту, гісторыі палітычных ідэй, арабскіх і іранскіх даследаванняў, палітыкі памяці.

Інстытут палітычных даследаванняў пастаянна праводзіць разнастайныя семінары. Інфармацыю аб іх можна знайсці на старонцы „Семінары”. Праўда, чамусьці апошнім часам справаздачы аб гэтых мерапрыемствах няма, што ўказвае на несвоечасовае аднаўленне ўсіх рубрык сайта.

Навуковая ўстанова займаецца актыўнай выдавецкай дзейнасцю. Аб выдадзеных кнігах можна было б даведацца са старонкі „Кнігі”, але яна недапрацаваная. Таму трэба зайсці ў рубрыку „Часопіс”, каб пазнаёміцца не толькі з перыядычным друкам інстытута, але і іншымі яго выданнямі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С к а р б ы БЕЛАРУСІ

Ружанскія руіны

Праязджаючы апошні раз машынай праз Ружаны, папрасіў я калегу збочыць з асноўнай трасы, каб паглядзець на руіны мясцовага палаца, колішняй знакамітай рэзідэнцыі славутага роду Сапегаў. Са здзіўленнем мы ўбачылі, што нядаўняе запусценне змяняецца адбудовай і рэстаўрацыяй былой велічы. У памяці заставалася карцінка дзесяцігадовай даўніны, калі на тэрыторыі комплекснага палацавага ансамбля было пуста і там пасвіліся авечкі мясцовых насельнікаў. Цяпер жа адбыліся кардынальныя зрухі — нядаўняя ўязная брама, якая рассыпалася ад вятроў і дажджоў, адбудавана ўжо цалкам, а на яе фасадзе з’явіўся складаны сапегаўскі геральдычны знак, на якім знайшлося належнае месца і гербу „Ліс”, і нашай „Пагоні”. Калі справа пойдзе так і далей, то можна будзе гаварыць пра істотнае адраджэнне архітэктурнай раскошы. Галоўнае — зберагчы старыя фрагменты, захаваць баланс паміж даўніной і сучаснасцю.

Сапегі займелі Ружану (так пачаткова называлася мясціна) у сваё валоданне ў самым канцы XVI стагоддзя. Заснавальнікам рэзідэнцыі на высокім марэнным пагорку быў сам канцлер Леў Сапега. Пры ім палацавы комплекс зазнаў першы росквіт, тут нарадзіўся яго першы сын Крыштап Мікалай. Гістарычных звестак пра першы ансамбль няшмат. Палац быў месцам сустрэч, каралеўскіх прыёмаў. Тут была бібліятэка на тры тысячы тамоў, збор партрэтаў і карцін. На схіле гадоў Леў Сапега прымаў тут караля Уладыслава IV — манарх і яго прыдворныя атрымалі шчодрыя падарункі. Пілі са старажытнага кубка „Іван”, які змяшчаў цэлы гарнец (гэтая тагачасная мера вадкасці складала амаль 4 літры) віна.

Пры сыне Льва Сапегі, Казіміру, разгарнулася ўсё мястэчка, якое мела ўжо каменную забудову, новы рынкавы пляц, 9 вуліц, назвы якіх сведчылі пра кірунак выезду. Другая палова XVII стагоддзя прынесла мясцовасці рабаванні і разбурэнні ад войскаў канфедэратаў і шведаў. Потым выбухнула Паўночная вайна. Толькі праз пяцьдзесят гадоў адбыўся рэнесанс ружанскага палаца. Звязаны ён найперш з імем знакамітага дойліда Яна Самуэля Бекера, саксонца па паходжанні, які доўга тварыў і жыў тут да скону свайго мецэната і патрона — канцлера ВКЛ Аляксандра Сапегі. Акрамя перапрыбудкі і перабудовы палацавага комплексу, Бекер спраектаваў тут Петрапаўлаўскі кляштар, капліцу св. Казіміра на могілках, карчму „Пад зоркай”, інтэр’ер Траецкага касцёла.

У 1829 годзе Ружаны перайшлі да Яўстаха Сапегі, які не застаўся ў баку ад надышоўшага вызвольнага паўстання, пасля паразы якога быў змушаны эміграваць, адрынуўшы прапанову цемрашала — расейскага цара Мікалая I прысягнуць яму на вернасць. Ружанскі маёнтак быў канфіскаваны і разрабаваны. Частка каштоўнасцей, дарэчы, трапіла праз Гародню ў Беласток.

Наступныя ўладальнікі ружанскай рэзідэнцыі — Піносы — разгарнулі ў палацавым комплексе мануфактурную вытворчасць, дбаючы найперш пра матэрыяльную выгоду. Аднак, ткацкая прадукцыя не знайшла попыту і славутая ружанская фабрыка спакваля пераўтварылася ў звычайны суконны ткацкі цэх. Неўзабаве былі страчаны адметныя парк і звярынец. Апісанне Ружанаў гэтага часу дае ў сваіх „Успамінах...” Леан Патоцкі.

У 1933 годзе высілкамі міністра замежных спраў Польшчы Яўстаха Сапегі-ўнука ружанскі комплекс быў вернуты ягонаму роду. Адбудову спыніла другая сусветная вайна, у час якой паўторна згарэлі палац і тэатральная афіцына.

„Руіны перажылі стагоддзі і будуць стаяць яшчэ... Руіны мінулае да нас наближаюць, чалавек нас у яго пераносіць”, — пісаў Леан Патоцкі...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

У Палічнай — два лагеры

Палічна — адна з большых вёсак Кляшчэлеўскай гміны. У мінулым лічылася актыўным салэцтвам на ніве грамадскай працы. Актыўна дзейнічала тут пажарная каманда, арганізаваліся грамадскія пачыны. Ініцыятарамі грамадскай актыўнасці былі Іван Пятрочук, Сцяпан Назарук, Мікалай Дудар ды мясцовыя настаўнікі з кіраўніком школы Антонім Леўшам на чале. Дзякуючы іхняй настойлівасці і падтрымцы дружнай вясковай грамадскасці ўзнікла пажарнае дэпо са святліцай, затым прыгожая школа. Былі пабудаваны два супрацьпажарныя басейны. Удзельнічаў я ў мерапрыемстве здачы ў карыстанне святліцы. Памятаю, што было гэта ў пачатках шасцідзесятых гадоў у час прыхадскога фэсту на Спленне. Зразу ажывілася культурнае жыццё, пачала працаваць бібліятэка, арганізаваўся мастацкі калектыў. Павятовыя ўлады прызначылі мастацкаму калектыву камплект музычных інструментаў. Вялікую актыўнасць на культурна-асветнай ніве праяўлялі настаўнікі. Дапамагалі яны арганізаваць пастаноўкі, рыхтавалі канцэрты ў сваёй вёсцы, наведвалі наваколле. У зімовы час хлопцы збіраліся па кватэрах, шылі каробкі з саломы. Кааператыў „Лес" і „Цэпэлія" скуплялі саламяныя вырабы. Нядрэнна плацілі, таму рукадзеллем займаліся не толькі мужчыны, але і жанчыны. Найбольшае зборышча, памятаю, было ў хаце каваля Мікалая Ігнацюка. Пры саломе кампанія днямі заседжвалася. Абед разам спажывалі, піва папівалі. Трапілася і мне нагода пабываць у такой кампаніі, калі заехалі мы ў Палічну з кінаперасоўкай. А паколькі было гэта перад Калядамі, у час посту, дык калегі пачаставалі мяне селядцамі з печанай бульбай. Страва аказалася вельмі смачнай. Вось, якая была палічанская кавалерка! З цягам часу ў Палічнай пачалі знікаць даўнейшыя звычкі. Выкрышвалася старэйшае пакаленне. Адышлі ў вечны спачын важакі пажарнікаў, а разам з імі і традыцыя грамадскіх пачынаў. Прыйшла эпоха рынкавай эканомікі. Цывілізацыйны прагрэс паўплываў на грунтоўныя перамены, якія не абмінулі і прыпушчанскіх вёсак.

Пасля шматгадовага перапынку наведаў я Палічну 17 снежня 2000 года. Калі ў размове з тадышняй солтыс Ірэнай Зінчук пацікавіўся я навінкамі, мая субяседніца сказала: „Будынак школы купіў бізнесмен Галёнка. Меў арганізаваць дом для састарэлых. Але засталася толькі гаворка. Разбурыў новы ўладальнік падлогі (быццам для рамонту). Ды так і пакінуў. Да кляшчэлеўскага бурмістра з просьбай звярнуўся, каб гміна ільготы ў падатку дала. (...) Абяцаюць рамантаваць святліцу. Як будзе? Невядома". Гэта было дзесяць гадоў таму. А зараз?... Да жніўня 2009 года была нявырашана праблема рамонту святліцы. Будынак папаў у руіну. Музычныя інструменты разграбілі ды са свечкай трэба іх шукаць. Школу бізнесмен прадаў іншаму прыватніку. Ніхто будоўляй не цікавіцца. Няма ўжо ў Палічнай даўнейшых „ідэалістаў", якія грамадскія справы ставілі б як дамінуючы фактар. Зараз „кожны сабе рэпку шкрабе". Жыхары вёскі падзяліліся на два лагеры. Закалот узнік у мінулым годзе пасля самаўрадавых выбараў. А было гэта так. Калі ў Кляшчэлях на пасаду бурмістра падалі заявы дасюлешні граданачальнік Аляксандр Сяліцкі і былая працаўніца мясцовага самаўрада Ірэна Негярэвіч, жыхары мястэчка і навакольных салэцтваў падзяліліся на два лагеры. Адны сталі на баку Сяліцкага, іншыя падтрымалі ягонага контркандыдата. Ірэна Негярэвіч перамагла саперніка 275 галасамі. Стороннікі Сяліцкага перайшлі ў апазіцыю. Для палічанскіх апазіцыянераў не спадабалася новая бурмістр, так як і мясцовая радная ды солтыс, якія перамаглі сапернікаў з процівстаўнага лагера. І гэта ў нарастаючым закалоце даліло алею ў агонь. Абвінавачванні выносіліся як у адрас новай бурмістр, што на працу прымае пабрацімаў, так і раднай ды солтыса, што не праяўляюць грамадскай дзейнасці...

Старая школа

Адрамантаваная святліца

Каб высветліць недаразуменні, падаўся я ў Палічну. Было гэта 12 лістапада. З Чаромхі адправіўся я на рэйкавым аўтобусе ў 9:25. З чыгуначнага прыпынку ў вёску дабіраўся я на ровары. Упершыню падарожнічаў па свежапракладзенай асфальтоўцы Кляшчэлі — Палічна. Перш-наперш наведаў я Валодзю Назарука. Праблема пры тым узнікла, бо вёска так перамянілася, што не пазнаў я хаты прыяцеля. Калі запытаў пра солтыса, калега загаварыў:

— Сёння ў святліцы маем імпрэзу. У мастацкай частцы будуць выступаць калектывы з Дубяжына, Дабрывады і Тапаркоў. Прыязджай, — запрашаў прыяцель. — Канцэрт у 16 гадзін пачынаецца... Ад Назарука падаўся я да солтыса. Не заспеў гаспадыні ў хаце. У святліцы з сяброўкамі рыхтаваліся да імпрэзы. Рашыў і я туды заехаць...

(працяг будзе)

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Анатоля Сыса.

1. правы прыток Волгі ў Калузе = 35 _ 21 _ 22 _;
2. установа бюракрата = 65 _ 64 _ 72 _ 73 _;
3. павозка з аглоблямі = 70 _ 69 _ 48 _;
4. лёгкае дысцыплінарнае спагнанне = 57 _ 58 _ 59 _ 60 _ 61 _ 66 _;
5. суседка Бельска і Сямятыч = 14 _ 15 _ 9 _ 34 _ 32 _ 33 _ 5 _ 6 _;
6. мангольская пустыня = 11 _ 12 _ 29 _ 30 _;
7. кабан = 13 _ 28 _ 27 _ 26 _;
8. яма = 18 _ 17 _ 16 _;
9. венская рака = 74 _ 10 _ 75 _ 76 _ 77 _;
10. дробны шкодны вопратцы і зерню матылёк = 7 _ 8 _ 63 _ 4 _;
11. гара грэчаскіх муз = 45 _ 52 _ 31 _ 19 _ 24 _ 25 _;
12. лётчык = 36 _ 39 _ 38 _ 37 _ 40 _;
13. рак на бязрыб'і = 47 _ 71 _ 1 _ 2 _;
14. горад з Ватыканам = 51 _ 20 _ 68 _;
15. вёска = 54 _ 44 _ 55 _ 56 _;
16. „сталовая" немаўляці = 3 _ 62 _ 43 _ 42 _ 41 _;
17. урачыстая гадавіна = 53 _ 49 _ 50 _ 23 _ 46 _ 67 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 45 нумара

Дынама, афіша, ладан, паляна, Радунь, музей, По, база, руда, чвэрць, Ева, ціск, выган, жыта, вантробы, воблака.

Рашэнне: **Разумны піша для забавы, а дурань чытае бо цікавы**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

11.12 — 17.12

(22.03. — 20.04.) 11-14.12. можаш ублытацца ў клопаты, не па сваёй віне. Трымайся здалёк ад падазроных інтарэсаў і людзей, якія асабліва ахвотныя табе памагчы. З 14.12. (да 22.12.) будуць накапляцца цяжкасці — не гарачыся і будзь асцярожным у пачуццях. З 16.12. (да 20.12.) можаш мець праблемы з тым, каб дагаварыцца. Гадавы баланс і так будзе на плюс!

(21.04. — 21.05.) Хуценька рэалізуй што трэба, бо твае планы папсуе непрыязная Ліліт, асабліва ў ладах з людзьмі; можаш пасварыцца з прыхільнікамі; асабліва з 16.12. Не вырашай тады важнага, трымайся здалёк ад незнаёмцаў, не чакай, што цябе ўсе палюбяць.

(22.05. — 22.06.) Аддыхаешся, станеш больш самаўпэўненым, гатовым на супрацоўніцтва. Пазнаёмішся з кімсьці, хто для цябе шмат зробіць. Пачні тое, шо будзеш працягваць у наступным тыдні. Ды 11-14.12. магчымыя праблемы на працы, можаш не схацець падпарадкавацца, выконваць загадаў, пільнавацца тэрмінаў.

(23.06. — 23.07.) 11-14.12. твае мары здзейсняцца, асабліва калі марыш аб вялікім каханні. Разагрэе цябе энергія, энтузіязм і жыццярадаснасць, у галаву заляцяць табе неблагія задумы, якія можаш пачаць рэалізаваць. Можаш атрымаць прапанову, на якую трэба адказаць маланкава, ды пачынай справу ў апошнім тыдні.

(24.07. — 23.08.) Будзеш больш уважлівы, усё ахопіш, дагледзіш дэталі, знойдзеш простыя развязкі. Больш зоймешся хатай, і будзеш мець пры тым памочнікаў. Калі ты шэф, не будзь дыктатарам, бо і ворагаў сабе можаш нарабіць. 10-14.12. — кепскі час на кулінарыя эксперыменты; не мяняй дыеты.

(24.08. — 23.09.) 14.12. — добры момант пачаць важныя справы. Навучышся супрацоўнічаць, дагаворышся. Можаш дасягнуць вельмі відных поспехаў, не разлічваючы на іншых, здабыць немалую ўзнагароду. Калі паявіцца вельмі карысная прапанова — не раздумвай.

(24.09. — 23.10.) Будзеш мець галаву на карку! Ды аж стомішся ад спраў, таксама псіхічна. Спараваныя Шалі схочуць зашалець і выбрацца ў далёкую экскурсію. Не спалохаешся ўколаў, звярніся да натуральнай медыцыны. Ды з 16.12. (да 20.12.) лепш не дамаўляйся на важныя сустрэчы, каб не расчаравацца.

(24.10. — 22.11.) Апошняя дэкада — магічны час для цябе. Будзеш цешыцца ўсім, не прыкмячаць заган. Пааддаеш даўгі, ды і заробіш. Станеш больш незалежным. Сябрам заімпануеш адвагай. Не прытварайся мацаком, калі баліць — бяжы да лекара! На невясёлыя думкі найлепшая — праца!

(23.11. — 22.12.) Да 20.12. ты вельмі вясёлы, дасціпны, будзе цябе трымацца шчасце. Не трэба табе ніякіх падмацункаў! Робіш на ўсіх вялікае ўражанне, удадуцца ўсе твае публічныя выступленні. Твае задумы могуць прынесці немалыя грошы. Не адмаўляйся прыгадаць аб сваіх заслугах!

(23.12. — 20.01.) Яшчэ цяжкавата і з натугай у пошуках лягчэйшых выхадаў. Добры настрой залежыць ад цябе, дык знайдзі час на ўласныя прыемнасці. Вялікая папулярнасць сярод іншага полу! Вельмі дбай аб сваё здароўе з 16.12. (да 20.12.), і могуць цябе ў гэты час пакрытыкаваць слабейшыя за цябе!

(21.01. — 19.02.) Будзеш гуляць і браць з жыцця тое, што найлепшае. Будзеш майстрам флірту і прывабнасці. Можа вярнуцца да цябе былое каханне (нават калі з-за цябе было выліта шмат слёз). Не гуляй з пачуццямі!

(20.02. — 21.03.) Новыя шанцы. Адчуеш (15-19.12.), што ўсё ідзе ў адпаведным напрамку. Не прадбачваюцца праблемы ў пары, хоць агулам у хаце будзе досыць напружаная атмасфера. На працы будзеш мець магчымасць паказаць свае перавагі; будзеш на плюсе. Хоць можаш накупляць непатрэбшчыны.

Агата АРЛЯНСКАЯ

У Тыневічах асвяцілі старую школу

Фота і тэкст
Ганны КАНДРАЦЮК

Анна Галавачык і Валянціна Ваўранюк заранёў прыехалі ў святліцу і адразу хацелі вяртацца дамоў. Пераблыталі яны гадзіны і цяпер сядзі тут без справы, сярод незнаёмых. Бо найперш з'явіліся працаўнікі гміны, госці з Беластока, журналісты.

— Трэба дахаты, — пачала адна.

— Ну, а як не *здонжыш* на час вярнуцца? — другая на тое.

— То і без мяне абыдзецца, — адказала першая.

— І без мяне абыдзецца. А ж бацюшка гаварыў, каб усе прыйшлі. Цэлая парафія.

У час кароткай гутаркі аказалася, што ў жанчын сваё ўяўленне пра культурныя мерапрыемствы ў вёсцы: *паспяваюць, паскачуць і ўсё.*

Цяпер таксама больш за ўсё цікавілі іх новыя гардыны колеру бардо, якімі завесілі вокны. І цэлы будынак, якія якраз прайшоў еўрарамонт.

Вось сёння, 20 лістапада, сышліся ўсёй парафіяй разам з бацюшкам Андрэем асвяціць будынак, каб служыў і працвітаў многія гады і *многая лета.* Якая для Тыневіч карысць будзе?

— Карысць на кожным кроку. Абедні саракавыя, памінкі, абедні гадавыя...

— Ужо і з гарадоў прыязджаць сталі, гасціны тут ладзяць. І весялей з-за гэтага стала. Нядаўна з Беластока блізнятак хрысцілі: Аню і Дзіяну. А тую Дзіяну то бацюшка Дар'яй ахрысціў, каб па-праваслаўнаму атрымалася...

Я спытала яшчэ пра забавы на парафіяльнае свята Лукаша, якімі ў мінулым славілася мясціна.

— А ну іх, з забавамі! — ускіпелі на гэтае слоўца цёткі, — пайшлі яны кебені м...

— А чаму так?

— А вы не чулі, што ў Нарве выпраўляюць? — адказалі мне жанчыны. — Як там забава, усё там пакотам павалена, збіта, патоптана. Навошта нам тое *тарнада?*

* * *

Пасля зышліся людзі і запанаваў добры спакой.

Асвячэнне святліцы сышлося з культурнай падзеяй, звязанай непасрэдна з Вялікімі Тыневічамі. У спетаклі „Ой, даўно-даўно" выступіла ўнучка героя п'есы Нінка Ваўранюк. Яна распавяла гісторыю дзедкі Валодзі. Пра тое, як забралі яго на прымусовыя работы ў Германію. Як сумаваў ён па родных лугах, вёсцы. І як у цяжкі час умеў цаніць жыццё.

У пастаноўцы што і раз з'яўляліся знаёмыя месцы, людзі, падзеі...

— Ну што тут сказаць, — не скрываў захаплення Ян Асташэўскі, — той спектакль для мяне чыстая радасць. І стары і малады тое добра паняў. Бо яны захавалі такую *ензыковосць* праваслаўную. Добра, што разам з новым рамонтам вярнулася да нас старое, тыя ўспаміны нашых бацькоў, дзядоў, бабуль. А то ж была ўжо *пусцізна* ў сяле. Ані школы, ані святліцы, адна царква асталася...

Мой субяседнік не забыўся пахваліць сваіх гаспадароў гміны. Старога войта Якуба Садоўскага, які пачаў рамонт, значыць, зрабіў праекты і планы, і маладога Андрэя Пялсковіча, *які ўсё элегантна закончыў...*

Айцец Андрэй Кос асвячае святліцу

Спявае Нарва

Выступае Беласток

Свята, што не казаць, мабілізавала гміну. Сярод ганаровых гасцей былі новы войт Андрэй Пляскавіч з жонкай Аннай, старшыня Рады гміны Ева Урбановіч, дырэктар Дома культуры Тамара Юшкевіч, настаўнікі, радныя. Абавязкі гаспадара ўзяў на сябе бацюшка Андрэй Кос. Яшчэ да спектакля ён асвяціў усе памяшканні ў будынку: святліцу, кухню, новую прыбіральню, гаспадарчы пакой. І разам з людзьмі паглядзеў спектакль:

— Гэты спектакль адчыніў нам уяўленне на расказы мінулага. Мы ўсё недастаткова гаворым дзецям пра сваю гісторыю, пра тое, як калісь было. Сучасныя людзі ўсё настаўляюцца на дзікую свабоду: рабі, што табе падабаецца, што табе падыходзіць. А мы павінны гаварыць маладым пра мінулае, каб не згубіць лучнасці пакаленняў, — сказаў бацюшка.

У „Падляшскіх хроніках" бацюшка сустрэў родныя аколіцы:

— Мая мама з Елянкі, таму, слухаючы расказ з яе вёскі, адчуў быццам там фізічна пабываў, сустрэўся з людзьмі, пагаварыў...

У цэлай парафіі айца Андрэя дванаццаць дзяцей. Гэта на дзве вёскі: Вялікія Тыневічы і Лапухоўку. У Забалацці, лясным урочышчы, прыпісаным да парафіі, даўно ўжо няма маладых.

* * *

У адрамантаваным і асвечаным будынку калісьці працавала школа (царкоўна-прыхадская школа існавала тут з 1902 года). Цягам апошніх гадоў месца шанавалі (чытайце: ніколі не ладзілі забавы), тут арганізавалі пастаноўкі з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя", ладзілі сямейныя мерапрыемствы, найчасцей хаўтурнага характару. У старой школе працавалі славутыя „Тыневічанкі", ладзілі рэпетыцыі, святкавалі свае поспехі і гадавіны. Іх песні, індывідуальнасці і поспехі выдатна паднялі прэстыж Вялікіх і Малых Тыневічаў:

— Не злічыць, колькі важных людзей тут перавінулася, — успамінае Ян Асташэўскі. — Сам ваявода да нас прыязджаў. Усе прыязджалі. А цяпер быццам таго і не было... Каб у такой святліцы не было аднаго іх здымка?

— Ну, так, — кажу і сама здзіўляюся гэтай нястачы. — Кожны беларус ведае песню вашых „Тыневічанак" *Дзе бы ты не пасяліўся, дзе б не звіў сабе гняздо...*

— Не ведаю, што гэта дзеецца на свеце, — задумваецца ўголас Ян Асташэўскі. — А можэ *формы унійнэ* того нэ любят?



ISSN 0546-1960